16+

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 4 (5314) 31 студзеня 2025 г.

ISSN 0024-4686




Мінулае ў беласнежнай завеі
стар. 6



У кожнага свой Купала
стар. 12




Герой нашага часу
стар. 13

# Адчуваць сябе часткай народа




*Фота Віктара Драчова.*

Уапошні дзень рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» асноўнай пляцоўкай стала Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Побач з галоўнай кніжнай скарбніцай працавалі інтэрактыўныя зоны, праходзіў канцэрт «Мы разам!». Нягледзячы на моцны, пранізлівы вецер, тут было горача: на сцэну выходзілі таленавітыя маладыя спевакі і блогеры. Адчуванне было, што на сустрэчу з кумірамі з'ехаліся маладыя фанаты з усяго Мінска. Хлопцы і дзяўчаты спявалі разам з любімымі выканаўцамі, рабілі сэлфі і відэа з канцэрта.

З самай раніцы быў запушчаны квэст «Гэта ўсё маё роднае» — каманды па 5—10 чалавек павінны былі за кароткі час паспець прайсці некалькі станцый з падрыхтаванымі для іх пытаннямі па культуры, гісторыі, літаратуры, расказаць альбо даведацца пра дасягненні нашай краіны, выканаць танцавальныя і песенныя заданні. За дзень квэст прайшлі 179 каманд (каля дзвюх тысяч чалавек). А фіналам акцыі стаў флэшмоб «Спяваем гімн усе разам». Спяваць прыехалі прадстаўнікі навучальных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый. Да вялікага хору, які сабраўся на прыступках Нацыянальнай бібліятэкі, далучыліся арганізатары мерапрыемства, валанцёры, блогеры і шматлікія госці.

# Пацвердзілі зацікаўленасць у захаванні міру

**Паводле ацэнак міжнародных назіральнікаў, выбары ў Беларусі былі дэмакратычнымі і адкрытымі, заявіў журналістам старшыня ЦВК Беларусі. «У нашай краіне працавалі 486 міжнародных назіральнікаў. І хачу сказаць, што і ў перыяд назірання за выбарамі, і ў час сустрэч, і цяпер, пасля правядзення выбараў, усе падкрэсліваюць, што працэс быў дэмакратычным, адкрытым, транспарэнтным, — расказаў Ігар Карпенка. — Шырокі спектр прадстаўніцтва міжнародных назіральнікаў гаворыць аб тым, што цікавасць да нашых выбараў была дастаткова высокай і што Беларусь была на выбарах адкрытая і даступная».**

### ШАС прызнае выбары ў Беларусі празрыстымі, дакладнымі і дэмакратычнымі

Місія назіральнікаў ад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ўпершыню прымала ўдзел у назіранні за выбарамі ў Беларусі. У складзе місіі, якая працавала на выбарчых участках на працягу пяці дзен, за выбарамі назіралі 17 прадстаўнікоў з сямі дзяржаў — членаў ШАС. За час работы члены місіі наведалі 109 выбарчых участкаў. Яны адзначаюць актыўны ўдзел грамадзян у галасаванні і высокі прафесійны ўзровень падрыхтоўкі супрацоўнікаў участковых выбарчых камісій. «Дзейнасць выбарчых камісій насіла вельмі публічны, кваліфікаваны і незалежны характар, — звярнуў увагу кіраўнік місіі назіральнікаў ад ШАС, Генеральны сакратар ШАС Нурлан Ермекбаеў. — Мы заўважылі высокую актыўнасць моладзі. Галасаванне ўсюды праходзіла спакойна, у рамках устаноўленага парадку ў прысутнасці прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі».

Як падкрэсліў генсек ШАС, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адпавядалі патрабаванням выбарчага заканадаўства нашай краіны, міжнародным абавязацельствам, прынятым Беларуссю.

«Парушэнняў норм нацыянальнага заканадаўства, якія ставілі б пад сумненне легітымнасць выбараў і якія маглі аказаць уплыў на вынікі выбараў, місіяй не адзначана, — рэзюмаваў Нурлан Ермекбаеў. — Місія прызнае выбары, якія адбыліся, празрыстымі, дакладнымі і дэмакратычнымі».

### «Выбаршчыкі пацвердзілі зацікаўленасць у захаванні міру, стабільнасці ў сваёй краіне»

Місія назіральнікаў ад СНД — найбольш шматлікая міжнародная місія, якая вяла назіранне за выбарамі Прэзідэнта Беларусі. У яе склад уваходзілі 296 прадстаўнікоў з сямі дзяржаў Садружнасці. На працягу датэрміновага галасавання і ў асноўны дзень выбараў назіральнікі ад місіі СНД наведалі 2383 выбарчыя ўчасткі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Ажыццяўляць маніторынгавую дзейнасць у нашай краіне місія ад СНД пачала 19 снежня. За паўтара месяца работы назіральнікі мелі добрую магчымасць назіраць за падрыхтоўкай да выбараў, за правядзеннем датэрміновага галасавання і галасавання ў асноўны дзень, што дазволіла даць аб'ектыўную ацэнку галоўнай электаральнай падзеі.



Фота БелТА.

«Тыя ацэнкі, да якіх мы прыйшлі ў выніку назірання за выбарамі, грунтоўныя і аб'ектыўныя, — падкрэсліў кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД, Генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў. — Мы глыбока ўпэўнены ў тым, што наша выніковая ацэнка адпавядае рэаліям. І ўсе іншыя ацэнкі, асабліва здалёку, не маюць ніякай падставы. Выбары былі адкрытымі, дэмакратычнымі».

Па словах генсека СНД, назіральнікамі ад Садружнасці грубых парушэнняў у ходзе правядзення выбараў заўважана не было. «Мы не ставілі сваёй задачай выявіць пэўныя недахопы, упушчэнні, маўчаць аб іх, а потым пасля выбараў размахваць імі, як некаторыя заходнія назіральнікі робяць, — удакладніў Сяргей Лебедзеў. — Калі мы дзесьці бачылі нейкія ўпушчэнні, адразу ж звярталіся да адпаведных кіраўнікоў, як правіла, старшыняў участковых выбарчых камісій, і ўказвалі на іх».

Кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД падкрэсліў: «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзены ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, былі свабоднымі, празрыстымі, канкурэнтнымі, адпавядалі прынцыпам правядзення дэмакратычных выбараў. Выбары забяспечылі правы грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду волевыяўлення».

Генсек СНД адзначыў высокую яўку на выбарах. «Выбаршчыкі сваёй актыўнасцю пацвердзілі зацікаўленасць у захаванні міру, стабільнасці, дабрабыту ў сваёй краіне», — рэзюмаваў Сяргей Лебедзеў.

### «Абноўленая мадэль выбараў у Беларусі забяспечыла абарону электаральнага суверэнітэту»

Каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад Парламенцкай Асамблеі АДКБ, намеснік Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Вікторыя Абрамчанка адзначыла, што ўдзел у выбарчай кампаніі пяці кандыдатаў забяспечыў спаборніцкі характар выбараў і даў выбаршчыкам рэальную магчымасць прыняць усвядомленае рашэнне.

«Цэнтральная выбарчая камісія і сродкі масавай інфармацыі далі грамадзянам Беларусі ўсю неабходную інфармацыю аб кандыдатах і іх перадвыбарных праграмах, — удакладніла яна. — Перадвыбарная агітацыя праходзіла ў адпаведнасці з заканадаўствам і не парушала правы ўдзельнікаў выбарчага працэсу».

Вікторыя Абрамчанка ўказала на тое, што назіральнікі ад палітычных партый кандыдатаў мелі ўсе ўмовы для выканання сваіх функцый, што сведчыць аб адкрытасці выбарчага працэсу.

Каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад Парламенцкай Асамблеі АДКБ падкрэсліла: «Абноўленая мадэль выбараў у Беларусі забяспечыла абарону электаральнага суверэнітэту, інтарэсаў усіх удзельнікаў і садзейнічала далейшай актывізацыі грамадзянскай супольнасці».

Па яе словах, адкрытасць і галоснасць выбараў пацвярджалася вялікай колькасцю міжнародных назіральнікаў і прадстаўнікоў замежных СМІ. «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся, былі дэмакратычнымі, канкурэнтнымі, празрыстымі, прамымі, сапраўднымі, публічнымі, свабоднымі і справядлівымі», — рэзюмавала каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад Парламенцкай Асамблеі АДКБ.

### Панафрыканскі парламент: «Абстаноўка на выбарчых участках стапрацэнтна адпавядала ўсім міжнародным стандартам»

Кіраўнік дэлегацыі, старшыня Панафрыканскага парламента Фарчун Зэфанія Чарумбіра выказаў удзячнасць за запрашэнне назіраць за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі. Місія назіральнікаў Панафрыканскага парламента ўпершыню ажыццяўляла маніторынгавую місію ў нашай краіне.

«Мы ўпершыню знаходзімся і назіраем за выбарамі ва Усходняй Еўропе, у гэтай частцы свету мы не былі ніколі, — удакладніў ён. — Беларусы — вы першыя, хто праявіў такую ступень адкрытасці і запрасіў Панафрыканскі парламент».

У Панафрыканскага парламента — сур'ёзны вопыт назірання за выбарамі ва ўсіх краінах Афрыкі, на іншых кантынентах. «Мы добра знаёмыя з міжнароднымі стандартамі і разумеем, як павінны праходзіць выбары, — паведаміў старшыня Панафрыканскага парламента. — Калі мы даём ацэнку выбарам, у першую чаргу звяртаем увагу на тое, як галасуюць людзі».

Фарчун Зэфанія Чарумбіра паведаміў, што перш чым прадстаўнікі міжнароднай місіі накіраваліся на ўчасткі для назірання, яны вывучылі нашы дакументы — Канстытуцыю і Выбарчы кодэкс. «Ваш Выбарчы кодэкс карэлюе з кодэксамі ва ўсім свеце», — канстатаваў кіраўнік місіі ад Панафрыканскага парламента.

**Вераніка КАНЮТА**



**Алесь Карлюкевіч, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар выдавецтва «Беларусь»:**

«Першае, што характарызавала дзень выбараў, — спакой і цішыня. Мы ведаем, якая даволі вялікая лічба тых, хто прагаласаваў датэрмінова. З усіх пунктаў гледжання — усё было арганізавана на дастаткова высокім узроўні. Мы бачылі той аб'ём працы ў інфармацыйным цэнтры, які прарабіла Цэнтральная выбарчая камісія, бачылі і стойкі з літаратурай, колькі цудоўных кніг было выпушчана. Асабліва ўражвае, што маладым выбаршчыкам перадаецца кніга "Сімвалы суверэннай Беларусі". У ёй раскрываюцца як дзяржаўныя, так і нацыянальныя сімвалы».



**Ігар Марзалюк, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член СПБ:**

«Беларусь з'яўляецца суб'ектам міжнароднага права. Беларуская суб'ектнасць і нацыянальная дзяржаўнасць — геапалітычныя рэаліі. Мы маем свой адметны нацыянальны твар, адметную пазіцыю і ў найлепшых беларускіх нацыянальных традыцыях мэтанакіравана, асэнсавана і ўпарта цярэбім сваю дарогу. Гэта тое, пра што калісьці сказаў Жылка: беларус, калі ўжо ўскараскаўся на гэтую палітычную карту свету, то ён з яе не знікне да другога прышэсця Хрыстовага. Я абсалютна згодзен з нашым Прэзідэнтам, які сказаў, што гэтая пяцігодка будзе пяцігодкай умацавання нашай суверэннай дзяржаўнасці. Гэтыя пяць гадоў мы павінны патрацідь такім чынам, каб ніхто не мог і сумнявацца ў тым, што мы, як дзяржаўная рэальнасць, не знікнем з карты свету».



**Наталля Карчэўская, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

«На мой погляд, сёлетняя выбарчая кампанія вызначылася вельмі высокім узроўнем арганізацыі. Як ніколі адчувалася святочная атмасфера і адсутнічаў элемент трывожнасці, які меў месца быць у папярэдняй выбарчай кампаніі. Нарэшце, спадзяюся, пераважная большасць нашага насельніцтва зразумела і свядома падышла да таго, што выбар людзей — гэта толькі іх выбар, а не тое, што падказалі ў тэлеграм-каналах або ў іншых сацыяльных сетках. Прэзідэнцкія выбары ў 2025 годзе — асаблівыя».

# Аляксандр Лукашэнка: «Ад вынікаў працы вучоных залежыць не толькі дабрабыт, але і будучыня Беларусі»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў дзеячаў навукі, работнікаў навукова-даследчых інстытутаў і ўстаноў вышэйшай адукацыі з Днём беларускай навукі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Гісторыя роднай зямлі славіцца імёнамі вучоных, якія ва ўсе часы самааддана і адказна працавалі ў імя прагрэсу, умацоўвалі інтэлектуальны патэнцыял нацыі, — гаворыцца ў віншаванні. — Дзякуючы назапашанаму вопыту, пераемнасці навуковых школ, укараненню сучасных перадавых тэхналогій Беларусь з'яўляецца высокаразвітой краінай, захоўвае за сабой вядучыя пазіцыі на міжнароднай арэне ў розных галінах навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што менавіта навука дае імпульс развіццю эканомікі і грамадства, забяспечваючы бяспеку і суверэнітэт, ствараючы трывалую аснову для камфортнага і спакойнага жыцця мільёнаў грамадзян. «У многім ад вынікаў працы вучоных залежыць не толькі дабрабыт, але і будучыня нашай Радзімы», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што беларускай навуцы пад сілу выкананне самых амбіцыйных задач і рэалізацыя самых смелых ідэй, калі кожны будзе і надалей працаваць на вынік, аператыўна рэагаваць на змяненні, якія адбываюцца, і пастаянна рухацца наперад.

«Моцнага вам здароўя, шчасця, міру, новых навуковых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

# Вытокі беларускага народа

**Палітыка і гісторыка, старшыню Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Марзалюка добра ведаюць і як пісьменніка, публіцыста, аўтара многіх гістарычных кніг.**

Доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар, ён яшчэ з'яўляецца і членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Новая кніга Ігара Марзалюка, выданне якой ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, — «Ад Русі і Літвы да Беларусі: вытокі і генезіс беларускага народа», пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». Ва ўступным артыкуле аўтар зазначае, што гэтая кніга — «...найперш аб нашай этнічнай і нацыянальнай гістарычнай тоеснасці, гісторыі нашага самаўсведамлення, нашай адметнасці. <...> Я падзяляю ідэі тых аўтараў, якія ў гісторыі чалавецтва вылучаюць супольнасці этнаграфічныя (патэнцыяльныя этнасы, ці протаэтнасы, этнаграфічныя агульнасці, якія не маюць этнічнай свядомасці, але маюць супольную матэрыяльную і духоўную культуру, этнічныя (супольнасці, члены якіх асэнсоўваюць сваю этнічную прыналежнасць, маюць этнічную самасвядомасць і асэнсоўваюць у якасці этнічных сімвалаў тыя ці іншыя ўласцівыя ім праявы матэрыяльнай ці духоўнай культуры) і нацыі)».

Ігар Марзалюк расказвае пра міфы і пра стварэнне гісторыі нашага беларускага народа, паказвае іерархію асноўных прыярытэтаў і вартасцей. Нацыянальная ідэнтычнасць на этапе свайго станаўлення вылучае нацыянальную гістарыяграфію, якая заўсёды мае палітызаваны і міфалагічны характар. Калі гаварыць вельмі коратка, то кніга — і пра пантэон нацыянальных герояў, і пра людзей, вучоных, якія стваралі гэты пантэон. Нягледзячы на ўсю складанасць тэмы, на зварот да многіх крыніц, кніга «Ад Русі і Літвы да Беларусі...» выглядае даволі прывабнай, чытэльнай. Несумненна, у сённяшнім вывучэнні айчыннай гісторыі не абысціся без гэтага выдання.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

# У гонар паэта

**У Лідзе да Дня беларускага пісьменства будзе ўстаноўлены помнік Валянціну Таўлаю. Днямі завяршыўся конкурс эскізных праектаў, на які было прадстаўлена восем работ беларускіх скульптараў. Журы вызначыла пераможцу. Ім стаў Сяргей Логвін, які вядомы такімі работамі, як помнік Якубу Коласу ў Стоўбцах і Льву Сапегу ў Слоніме. У конкурсе таксама прынялі ўдзел Максім Макарэвіч, Уладзімір Качан, Вадзім Вараб'ёў, Сяргей Гумілеўскі, Іван Міско з двума праектамі і аўтарская група ў складзе Антаніны Кумпяк, Максіма Рунца і Алеся Мяжэннікава.**

Як адзначыў загадчык кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Канстанцін Касцючэнка, журы разгледзела мноства прапаноў, з якіх былі вылучаны восем найбольш яркіх работ. На апошнім этапе засталіся тры прэтэндэнты, з іх і выбралі пераможцу. «Гэты вобраз, на нашу думку, упрыгожыць горад Ліду і стане напамінам аб асобах, якія ўзбагачаюць нашу культуру і гісторыю», — падкрэсліў Канстанцін Касцючэнка.

Вобраз знакамітага беларускага паэта, удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі Валянціна Таўлая (1914—1947) выбраны невыпадкова. Яго жыццё цесна звязана з Лідчынай. Тут ён атрымаў пачатковую адукацыю, працаваў у рэдакцыі газеты «Уперад» (цяпер «Лідская газета»). Пасля вайны быў намеснікам дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Мінску. Валянцін Таўлай трагічна загінуў ва ўзросце 33 гадоў.




Менавіта трагічны жыццёвы шлях знакамітага беларуса адлюстраваны ў вобразе будучага помніка. Валянцін Таўлай, у руках якога нумар газеты «Уперад», глядзіць у будучыню з надзеяй. Мяркуецца, што помнік будзе з бронзы, яго ўстановяць у паркавай зоне на вуліцы, якая названа ў гонар паэта. Адкрыццё помніка прымеркавана да Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе ў Лідзе.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

**Фота з адкрытых крыніц**

# «Чытаць з намі — утульна!»

«Ты адно запомні, браце, са "Звяздой" — цяплей у хаце!» І не трэба пытаць, чаму. Таму, што газета (як, дарэчы, і «Літаратура і мастацтва») — на роднай мове, таму, што чыталі іх яшчэ прадзеды, таму, што яны, апроч цікавай патрэбнай інфармацыі, радуюць падпісчыкаў прызамі. Сярод якіх былі (і ў даўніх чытачоў, напэўна ж, засталіся) халадзільнікі, палаткі, кухонныя камбайны, пральныя машыны, мікрахвалеўкі, веласіпеды, трымеры, мабільныя тэлефоны...

Усё гэта загадзя куплялася і анансавалася, карткі-купоны, якія друкаваліся на працягу падпісной кампаніі, дасылаліся ў рэдакцыю, рэгістраваліся і сартаваліся. А ўрэшце ў прысутнасці тыражнай камісіі, пасобку (па абласцях і горадзе Мінску) ссыпаліся ў чароўны саламяны капялюш, з якога даставаліся шчаслівыя. Такім чынам...




Канвектар *Edisson Polo 1500 M* выйгралі: Уладзімір Мікалаевіч Паўловіч, аг. Вулька-2 Брэсцкай вобласці; Франц Леанідавіч Валяўка, аг. Плюсы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці; Любоў Мікалаеўна Арлова, г. Петрыкаў Гомельскай вобласці; Мікалай Мікалаевіч Іваноў, г. п. Карэлічы Гродзенскай вобласці; Наталля Аркадзеўна Трыушэнка, в. Асавец Любанскі раён Мінскай вобласці; Валерый Мікалаевіч Гаўрыш, г. Чавусы Магілёўскай вобласці; Дар'я Станіславаўна Лосева, г. Мінск.



Суперпрыз — масляны радыятар *Neoclima NC 9309* — выйграў Міхаіл Пятровіч Батура, г. Бягомль Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці.

Віншуем! Тым жа, каму гэтым разам не пашчасціла, раім не засмучацца: гэта былі не апошнія прызы, не апошняя рэкламная гульня, у якой камусьці пашанцуе! Дык чаму б не вам, калі, вядома ж, загадзя афармілі падпіску на газеты «Звязда» ці (і) «Літаратура і мастацтва» на першае паўгоддзе 2025 альбо своечасова аформіце яе на другі квартал і пры гэтым не палянуецеся, запоўніўшы адпаведную картку, даслаць яе ў рэдакцыю?

Шанс на выйгрыш мае кожны.

**Афіцыйна:**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Чытаць з намі — утульна» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

Рэкламная гульня «Чытаць з намі — утульна» праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 снежня 2024 года да 31 сакавіка 2025 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» і газеты «Літаратура і мастацтва» на першы квартал або першае паўгоддзе 2025 года. Усяго ў гульні прынялі ўдзел 88 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 271 81 53.

# Што пісалі беларускія класікі пра добраўпарадкаванне?

**«Над гародам і садам — сонца. Віецца матавы гарох, пахне кропам і каноплямі, матылямі чырванее на градах мак, гудуць, вылятаючы з вулляў, пчолы. Лапушацца вялізныя, на чырвона-зялёных ножках-сцяблінках, лісты рэвеню, „беларускага апельсіна“. А ўначы, калі ляжыш на посцілцы пад дрэвам, часам чуеш, як глуха, нібы гіры, падаюць на дах антонаўкі і бубняць, ракочуць, скочваючыся па ім», — так узнёсла апісваў Уладзімір Караткевіч у эсэ «Зямля пад белымі крыламі» беларускую гасподу... Недарэмна гэты год абвешчаны Годам добраўпарадкавання — беларусы нават у часы нястачы імкнуліся да чысціні і прыгажосці. Цудоўную выцінанку на шыбу прыладзіць, кашулю вышыўкай аздобіць... Парадкавалі свой побыт і героі беларускай літаратурнай класікі.**



## «Гумно паўнела з кожным годам»



«Лад у хаце» — гэтыя словы часта сустракаюцца ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Героі, чые прататыпы — сам паэт у дзяцінстве і яго сям'я, у кожным куточку, куды закідвае лёс, парадкуюць гаспадарку. Аўтар ва ўсіх падрабязнасцях апісвае побыт вясковых беларусаў — працавітых, старанных, гаспадарлівых:

*Гумно паўнела з кожным годам,*
*І багацеў хлявец прыплодам,*
*І грош стаў лішні завадзіцца,*
*Было што есці, чым акрыцца,*
*І быў парадак, лад у хаце...*
*А цэлы рад збаноў на плоце*
*Казаў аб тым, што гаспадыня*
*Была ўжо ў моцнай каляіне*
*І што яе таксама справа*
*Вялася добра і рухава.*

## «Дачка прымусы папраўляе, а сын панчохі цыруе»



Выдатны прыклад працоўнага выхавання — аповесць Янкі Маўра «ТВТ». Пяцікласнікі вучацца вырашаць звычайныя побытавыя праблемы: зламалася крэсла, працякае дах, адарваўся гузік... Няўжо абавязкова чакаць, пакуль хтосьці направіць? Не дадзім рэчам уладарыць над сабою! І вось Стась прышывае вешалку да свайго паліто, Клава Макейчык ўзяла ды змазала дзверы, каб не рыпалі — «І адразу ў іх доме зрабілася так ціха, лагодна, нібы яны перасяліліся на другую кватэру». «Вельмі ўсцешыў і здзівіў бацькоў Толя Бяспалаў. У шуфлядах камоды даўно ўжо былі адарваны ручкі, і, каб адчыніць іх, патрабаваліся складанейшыя аперацыі... Можна цяпер уявіць сабе радасць сям'і, калі раптам у камоды з'явіліся ручкі, ды яшчэ якія: Паўлік узяў ды прымацаваў звычайныя электратэхнічныя ролікі». Больш за тое — дзяўчынкі браліся за паяльнік і малаток, а хлопцы — за іголкі і ніткі. «Бацькі зусім збіліся з панталыку. Што ж гэта робіцца ў іх доме? Дачка прымусы папраўляе, а сын панчохі цыруе! Увесь свет прайдзі — такога не ўбачыш.

Загаманіў і свет, у які ўваходзілі тры суседнія двары, і падзяліўся на дзве часткі.

— Вось гэта я разумею! — казалі ў адной частцы свету. — Цяперашняя моладзь не будзе такой бездапаможнай, як мы. Усё сама зробіць.

А ў другой частцы свету чуліся іншакшыя галасы:

— Ну, калі мужчыны пачнуць панчохі цыраваць ды кашулі латаць, а жанчыны прымусы ды боты папраўляць, — тады парадку не будзе. Спрадвеку кожны займаўся сваёю справай.

Трэба толькі адзначыць, што ў гэтай другой частцы свету налічвалася вельмі мала народу».

Янка Маўр, знаўца дзіцячай псіхалогіі, здолеў незвычайнае: нецікавыя побытавыя справы ахутаў рамантыкай, ператварыў ледзь не ў подзвіг, які можа ўчыняць штодня. Пакаленнямі дзеці вучыліся добраўпарадкаванню па яго кнізе.

## «Арлы на свет вылятаюць з такіх менавіта гнёзд»



Адзін з ранніх вершаў Уладзіміра Караткевіча, напісаны ў 1957 годзе, апісвае ўмоўны беларускі дом, які сімвалізуе ўсю Беларусь. І ў гэтым доме павінны быць мір і лад:

*Мір гэтаму дому,*
*Дзе шчасце мы бачылі ўсе...*
*...Прытульны, добры і цёплы*
*Наш беларускі свет.*
*Садок да рачулкі збягае,*
*Хатка глядзіцца ў плёс.*
*Арлы на свет вылятаюць*
*З такіх менавіта гнёзд.*

## «Вокны ягоныя небам зашклёны»

Аркадзю Куляшову давялося пакідаць Мінск пад нямецкімі бамбёжкамі. Працаваў у франтавых газетах, што мог, аддаваў дзеля Перамогі... Бачыў зруйнаваны акупантамі горад... А потым назіраў, як ён аднаўляецца, як беларускі народ здзяйсняе свой працоўны подзвіг. У 1946 годзе Куляшоў напісаў пра гэта верш «Дом»:



*Плотам драўляным яго на світанні*
*Абнеслі,*
*На рыштаванні*
*Пачуліся першыя песні.*
*Хай яшчэ вокны ягоныя*
*Небам зашклёны,*
*А ўжо здаецца,*
*Што выгляд змяніўся ягоны.*
*Гэткім зрабіўся ён, што нават хмарка*
*І тая*
*Стала над домам*
*І далей плысці не жадае.*
*Стала над ім нерухома,*
*А людзям здаецца,*
*Што гэта з коміна, з дома*
*Дым першы віецца.*

## «Павесіце на месца скінутыя лейцы»

У творах паэта Янкі Сіпакова, які з пакалення дзяцей вайны, жыве гістарычная памяць. Верш «Лягчэй вы мяралі, нашы прашчуры...» — пра повязь пакаленняў і пераемнасць традыцый. Паэт уяўляе, як увесну і ўвосень прашчуры наведваюць дамы, дзе жывуць іх нашчадкі:



*Перш чым зайсці у сцішаную хату,*
*Усё агледзіце руплівым вокам,*
*За кожны знадабень зачэпіцеся вы:*
*Вясной — у баране направіце кляцы,*
*Падмажаце рыпучыя калёсы,*
*Павесіце на месца скінутыя лейцы*
*І ў думках свайго сына пажучуваеце,*
*Што гаспадарыць ён не так, як вы.*
*А восенню ў вас іншы клопат —*
*Прыкінуць намалочанае збожжа,*
*Зірнуць, ці добра выкапана бульба,*
*Аўса насыпаць коням поўны жолаб*
*І ўзважыць добра ўлежанае сена —*
*Ці хопіць на зіму? А потым*
*Вы прыйдзеце ў цяплынь начную хаты*
*І сядзеце у покуце на лаву...*
*А потым, зноў збіраючыся з хаты,*
*Вы пакалышаце ліповую калыску,*
*Дзе ваш унук, прачнуўшыся, заплача.*

## «Шкрабла нажом стол, лавы, мыла ўсё»

Іван Мележ у «Людзях на балоце» апісваў родную вёску, і апісваў праўдзіва: ёсць і рупныя гаспадары, ёсць і лянівыя ды нядбайныя... Але працавітых усё-ткі больш — уменне трымаць у парадку сваю хату і сваю зямлю шануецца ў народзе спрадвеку. Вядома, вёска ў палескай глыбінцы бедная — чырвонаармеец Міканор, вярнуўшыся дадому, лепей за ўсіх бачыць недахопы: і хаты б святлейшымі ды чысцейшымі зрабіць, лазню б збудаваць... Але вось яго сям'я рыхтуецца да каляднай вячэры: «Увесь дзень перад „святым вечарам“ маці шкрабла нажом стол, лавы, мыла ўсё. Ад ранку ледзь не да самага вечара не тух у печы агонь, варыла, варыла, пякла. Вячэра мусіла быць посная, але ж трэба было згатаваць ні мала ні многа: дванаццаць страў!.. З пашанай і нейкай урачыстасцю сачыў бацька, як матка слала на вымытым стале сена, як накрывала яго чыстым настольнікам, як клала бохан хлеба, нож, лыжкі, ставіла конаўку з соллю. Памыўшы ў кутку над цэбрам рукі, ён, белы, у лапцях, у зрэбных штанах, у доўгай, да кален, сарочцы, падпяразанай святочным пояскам, пачакаў, калі падыдзе маці, і, не глянуўшы на Міканора, першы момант няёмка, стаў голасна маліцца».



Мележу не ўдалося дапісаць сваю «Палескую хроніку» — але чытачы ўсяго свету дасюль з задавальненнем сочаць, як яе героі змагаюцца за дабрабыт, адбіраюць у балатоў будучыя палеткі, як іх працавітасць дае плён.

Усё пачынаецца з дробных спраў, з уласнай кватэры, уласнага падворка. Гэтаму вучаць і класікі.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

# Чаго не ведаў Тодар Курбацкі

**Пра беларускіх пісьменнікаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, напісана даволі шмат. Праўда, пра адных — больш, пра некаторых — менш. На тое дзве прычыны. Першая залежыць ад іх унёску ў нацыянальную літаратуру. Другая ў нечым вынікае з першай. Па розных прычынах не ўсе яны належным чынам раскрылі талент. Ды і не ўсе іх публікацыі выяўлены. Да апошніх належыць і паэт Тодар Курбацкі. Па пашпарце — Фёдар Пракопавіч Курбацкі.**

Імя яго марна шукаць нават у шасцітомніку «Беларускія пісьменнікі» — біябібліяграфічнага даведніка такога кшталту няма на ўсёй постсавецкай прасторы. З-за таго, што адсутнічае Тодар Курбацкі, яшчэ большая прастора для пошукаў даследчыкаў, якіх цікавіць гісторыя нашай літаратуры. Прынамсі, згаданага перыяду. Адным з іх стаў доктар філалагічных навук Алесь Бельскі, які раскрыў абставіны яго жыцця і творчасці.

Пры гэтым ён, безумоўна, не мог абысціся без успамінаў пісьменнікаў, якія Тодара Курбацкага ведалі. Пэўныя звесткі яму далі паэты Мікола Аўрамчык і Павел Пруднікаў. Дапамог і мінскі журналіст Мікалай Шчэрбачэня. Выйшаў Алесь Іванавіч і на тагачаснага намесніка старшыні Кармянскага райвыканкама Віктара Мацвеенку. Гэты райцэнтр выбраў невыпадкова. Ужо ведаў, што Тодар Курбацкі родам з мястэчка Карма цяперашняга цэнтра раёна Гомельскай вобласці. Была ўдакладнена і дата нараджэння: 1904 год. Аб выніках сваіх пошукаў Алесь Бельскі расказаў у «ЛіМе» («Заранкавыя песні», 1 снежня 2000 г.).

Паэзію Тодар Курбацкі палюбіў рана, таму і з'явілася жаданне пісаць самому. Першыя публікацыі не выяўлены, ды і, хутчэй, спачатку ўсё пісалася «для сябе». Друкавацца пачаў пазней, калі вучыўся ў Магілёўскім беларускім педагагічным тэхнікуме. Сяброў там знайшоў нямала, але найлепшым стаў Павел Пруднікаў, які ўжо таксама пісаў вершы. Гэта і зблізіла іх, вырашылі разам паехаць вучыцца ў Мінск.

У пачатку 1930-х гадоў Тодар Курбацкі скончыў педагагічны інстытут у сталіцы рэспублікі. На гэты час прыпадаюць і яго публікацыі. Асабліва плённа выступаў у акруговай газеце Палескага абкама ВК КПБ(б) «Бальшавік Палесся». Аднак трапіў і на старонкі альманаха «Аднагодкі» (1934), друкаваўся ў часопісах «Беларусь калгасная», «Полымя рэвалюцыі», газетах «Літаратура і мастацтва», «Звязда», «Чырвоная змена».

Аб тым, што быў заўважаны, сведчыць удзел у 1938 годзе ў Рэспубліканскай нарадзе маладых аўтараў. На ёй прысутнічалі і тыя, хто пазней добра праявіў сябе ў літаратуры: ужо названы Мікола Аўрамчык, Аркадзь Марціновіч, Адам Русак, Уладзімір Шахавец, іншыя пісьменнікі. Аднак у сталіцы не застаўся. Паехаў на роднае Палессе: настаўнічаў у Хойніцкай сярэдняй школе № 1.

Калі падагульняць ўражанне аб напісаным ім, бадай, трэба пагадзіцца з Алесем Бельскім: «Паэтычная творчасць Тодара Курбацкага ў многім тыповая для таго даваеннага часу — аптымістычная, бадзёрарадасная і дэкларацыйная. Ён, як і многія яго аднагодкі, сцвярджаў сябе ў літаратуры ў пачатку — сярэдзіне 30-х гадоў, калі складвалася традыцыя парадна-святочнай паэзіі, існавалі каноны і ўзоры, па якіх маладыя аўтары вывяралі свой голас. Таму і Т. Курбацкі не пазбегнуў у сваіх вершах ідылічнасці, прамаўлення ў духу палітычных установак…».

Аднак трэба дадаць, што пры ўсім гэтым ён, як відаць па танальнасці твораў, быў шчыры. Жывучы ў сваім часе, гэты час і ўслаўляў. І радаваўся, калі яго вершы былі заўважаны. Асабліва ў рэспубліканскім друку. Як верш «Пажаданне» ў «ЛіМе», што прыйшоў да чытачоў 1 мая 1939 года.

Па датаванні відавочна, што ён успрымаўся святочным. Аб гэтым сведчыць верш «Таварышу Сталіну». Напісаны, як тлумачыцца пад ім, калектыўна: «Пісьмо склалі Якуб Колас, К. Крапіва, А. Куляшоў, Э. Агняцвет, М. Клімковіч». Яно было «прынята на агульным сходзе работнікаў літаратуры і мастацтваў гор. Мінска». Слоў няма: надрукавацца ў такім нумары не толькі прыемна, але і адказна. Такі гонар поруч з некаторымі іншымі аўтарамі выпаў і Тодару Курбацкаму.

Па праўдзе кажучы, верш «Пажаданне» асаблівай арыгінальнасцю не вызначаецца. З-за гэтага, бадай, Алесь Бельскі і не звярнуў на яго ўвагу ў сваім артыкуле пра Тодара Курбацкага. Але твор прываблівае тым, што напісаны ў традыцыях тагачаснай паэзіі, якая не толькі ўслаўляла велічнасць працоўных здзяйсненняў, але і адначасова ўвязвала іх з чыста чалавечымі якасцямі лірычных герояў. Такім шляхам пайшоў і Тодар Курбацкі. Гэта споведзь вясковай дзяўчыны, выдатнай працаўніцы, якая сутыкнулася ці не з першым сваім каханнем.



*Родныя мясціны Тодара Курбацкага.*

Пра яго канкрэтна не гаворыцца, аднак відаць са зместу твора. Праўда, таксама не адразу. Лірычная гераіня праз шмат гадоў наведвае родныя мясціны:

*Мне здаецца, мы ўчора*
*З пугай бегалі даўгой*
*Па далінах, па разорах —*
*За рагатай чарадой.*

*Ўсё мне гэтак прыгадалі*
*Поле, рэчка ды лугі,*
*Дзе калісьці сябравалі*
*Два малыя пастушкі.*

Пасля гэтай сустрэчы высвятляецца, што той, хто таксама стаў адным з лірычных герояў і каго ніяк не можа забыць гэтая дзяўчына, не проста знаёмец яе маленства. Хутчэй за ўсё і юнацтва, інакш даўно б забыўся. А так назаўсёды пакінуў след у яе душы. Ды, відаць, у іх былі не толькі сяброўскія стасункі. Іначай не з'явілася б такое: «…Ты сустрэўся, мой каханы // З добрай доляй на вяку». Толькі для каго гэта «добрая доля», а для каго — расчараванне: «От, ідзеш, такі прыбраны // Ды з нявестай пад руку».

Але верш «Пажаданне» пры ўсіх сваіх не надта выяўленых мастацкіх якасцях, будзем праўдзівыя, тым і прываблівае, што Тодар Курбацкі не пайшоў шляхам асуджэння таго, хто здрадзіў свайму каханню. Выснова твора такая:

*Мне казала малада,*
*Што вяселлю хутка быць.*
*Шчыра вам, сябры, жадаю*
*Дзетак з восьмера нажыць.*

*Каб у вас у кожна лета*
*На прыгожы час такі*
*Нараджаліся паэты,*
*Брыгадзіры, маракі.*

У нечым блізкія матывы гэтага твора і верша «Сяброўства». Лірычны герой таксама жыве ўспамінамі: «Зноў ты вабіш цёплым словам, // З кіпай кніжак, з скруткамі папер, // Добры друг, хлапец вясковы, // А цяпер — данбаскі інжынер». У абодвух еднасць асаблівага кшталту: «Жыць вялікай страснасцю эпохі // Пакляліся мы з табой тады…» Гэтая клятва і стала памяццю, якая з адлегласці паядноўвае душэўнай повяззю, а за ёю — не толькі дружба, не толькі сяброўства, але і супольная еднасць, народжаная ў шматнацыянальнай краіне:

*Прыязджай, і сам убачыш ты,*
*Як па Сожу трубяць параходы,*
*Як ідуць па Пряпяці плыты;*
*Як ад Мінска скрозь да Магілёва*
*Наліваюць нівы ды сады,*
*Прыязджай — і ты пачуеш спевы,*
*Што спяваюць нашы гарады.*

Спявала сэрца і самога паэта. Пра што заўгодна спявала, бо, відавочна, ён быў рамантыкам у душы, а для такіх людзей, што ні ўбачыш, — радуе. Калі ж яшчэ і лірык па складзе характару, то ўсё гэта хочацца апяваць. Не пакідалі абыякавым Тодара Курбацкага людзі, якіх ён ведаў, але і хвалявала і прырода, асабліва тады, калі ў ёй прысутнічае і плён працы. Як у вершы «Жніво»:

*Песня светлая ды стазвонная*
*Ўскалыхнула шыр залацістую.*
*Загайдалася жыта белае,*
*Жыта белае, каласістае.*

*І цвіце, гарыць ранне яркае,*
*Даль туманіцца мглою шэраю.*
*Спраўна ложыцца пад жняяркамі*
*Жыта буйнае, жытае спелае.*

Песенна-фальклорны матыў, што ўплятаецца ў сюжэтную канву твора, як быццам і непрыкметны — усяго адзін радок. Аднак разам з аўтарскімі развагамі ён шмат гаворыць. Не толькі ад імя лірычнага героя прамаўляецца ўсё, а ад усіх, каго з'яднала жніво:

*Маладыя мы, шчокі ружамі*
*Загарэліся, мо не спыніцца.*
*З песняй звонкаю, з песняй здужаем:*
*— Ой, калініца, ой, малініца.*
*Ну, напорысцей, ну, брыгадамі!*

Апошні радок на завяршэнні паўтараецца. Разам з іншымі малюнак жніва становіцца яшчэ больш запамінальным: «…Рукі чорныя, рукі мужныя, // Не стрымае жар // Працу творчую, працу дружную. // Ну, напорысцей, ну, з брыгадамі // Ну, з прыпеўкамі галасістымі!»

Лірычныя матывы надзіва кранальныя ў вершы «Пра цёплую вясну». Адметнасць яго ўжо і ў тым, што Тодар Курбацкі ў пэўнай ступені, як відаць з пачатку твора, зазірае і ў сваю мастакоўскую лабараторыю, гаворыць пра тое, як пішацца твор: «Вясёлаю зялёнай галавою // Кусты прыпалі к беламу акну, // Ізноў шуршыць папера пад рукою // І тчэцца верш пра цёплую вясну». На першы погляд, нічога новага. Ды гэта той выпадак, калі знаёмасць радка не адштурхоўвае. Наадварот, прыцягвае, бо знаёмае пераўтвараецца ў тое адкрыццё, што кампенсуецца шчырасцю пачуццяў. «Цёплая вясна» ва ўяўленні лірычнага героя — гэта калі адчуваеш, «як лашчаць баравыя шумы // І дышуць сонцам плённыя палі».

Перад вайной Тодар Курбацкі некаторы час жыў у вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна. З нападам фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз пайшоў на фронт. Дзе служыў, не вядома. Але што годна выконваў свой абавязак перад Радзімай, сумнення няма. Гэта відавочна з матываў любові да Айчыны, якія напоўнены яго асобныя передваенныя творы. Важна і тое, што належаў да тых аўтараў, якія вуснамі сваіх лірычных герояў не толькі дэкларавалі гэта, усведамленнем гэтага была напоўнена іх душа. У пэўнай ступені праграмным можна ўспрымаць яго верш «Ідзі, мая песня», што напісаны ў 1938 годзе ў Хойніках.

Бадай, напісаўся пасля вяртання з Мінска, пад ўражаннем ад нарады маладых аўтараў. Безумоўна, у цэнтры ўвагі на ёй — творчыя пытанні. Але не абыходзілася ўвагай і тое, што адбывалася ў краіне і ў свеце. Хоць у гэтым творы прысутнічаюць рытарычныя матывы, пафаснасць не надуманая, ёй жыло пакаленне 30-х гадоў. А свет быў трывожны, хоць калі ён не бывае не трывожным... Тодар Курбацкі не мог заставацца ўбаку ад таго, пра што гаварылася.

Былі ў яго і ўласныя думкі, суладныя тым, якія прысутнічалі ў паэзіі маладых творцаў. Ён падпарадкоўваў лірыку задачам дня. Тое, што прамаўляў, магчыма, у нечым і празмерна пафаснае, аднак адпавядала таму, чым жыло пакаленне 1930-х гадоў. Яно не толькі будавала новы сацыялістычны лад, але і было гатова даць адпор ворагам. Таму і заклікаў Тодар Курбацкі сваю паэтычную песню «хадзіць у армейскіх радах»:

*Ідзі, мая песня, ідзі жыві*
*У думах, у сэрцах, гарачай крыві,*
*Ўздымайся высока, бы воблачны птах,*
*Вучыся хадзіць у армейскіх радах.*
*Стань мужным армейцам*
*ў тугія калоны.*
*Там лепшыя тоны і рыфм перазвоны,*
*Я хочу, каб грозна на гадаў стаянкі*
*У часе паходаў хадзіла на танкі.*

Не адмаўляючы пры гэтым радасці мірнага, спакойнага жыцця: «Я хочу, каб песня праз дні і вякі // Па мірных дарогах вяла цягнікі, // Дзе нівы гамоняць, дзе спеюць ураджаі, // Дзе песня калгасніц пад сонца ўзлятае!». Але выснова тая, што гучала і на пачатку:

*За гэту радзіму плацілі крывёю*
*Найлепшыя людзі — народа героі.*
*За гэту радзіму з жыццём маладым —*
*Порах на варце трымаем сухім!*

Тое, што гаварыў вершам, стала рэальнасцю. Удзельнічаў у многіх баях. Ужо больш відавочным станавілася, што хутка настане дзень, якога з нецярпеннем чакала ўся савецкая краіна. На жаль, да яго не дажыў. Воіна Фёдара Курбацкага і паэта Тодара Курбацкага не стала 15 студзеня 1945 года. Аднаго не ведаў. Таго, што сам не паспеў зрабіць у галіне паэзіі, ды і, будзем справядлівымі, не ўсё дазваляў яго талент, здзейсніў у беларускай прозе адзін з яго вучняў хойніцкай сярэдняй школы, будучы народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ. Іван Паўлавіч назаўсёды захаваў удзячную памяць аб сваім настаўніку, які вучыў яго не толькі адданасці Радзіме, але і любові да літаратуры.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Час для аб'яднання

**Галоўнай тэмай апошняга нумара часопіса «Нёман» за 2024 год стала тэма сям'і, якая асабліва актуальная ў зімовыя святы, калі часцей збіраюцца разам. Аўтары ўспамінаюць дзяцінства, звяртаюцца да мінулага і шукаюць адказы ў беласнежнай завеі.**

Паэзія дванаццатага нумара «Нёмана» напоўнена лірычнасцю, цёплымі, знаёмымі кожнаму вобразамі, пэўнай доляй драматызму і меланхоліі, без якой не абыходзіцца апісанне зімовай атмасферы. Вершы Анатоля Аўруціна сканцэнтраваны вакол вечных тэм — хуткаплыннасці жыцця, самоты па родных мясцінах і вяртання да сапраўдных вытокаў. Яго паэзія спакойная, але, як хвалі на вадзе, здольна ўсхваляваць і захапіць нават самых строгіх крытыкаў. Пісьменнік у асноўным звяртаецца да мінулага, калі ў родным горадзе яшчэ віруе жыццё, а суседзі завітваюць на чаяванне. Утульная і мяккая творчасць Анатоля Аўруціна — добры пачатак для апошняга нумара. Не самотна і не занадта эксцэнтрычна, што дапамагае чытачу лепш паглыбіцца ў атмасферу часопіса. Верш у разуменні аўтара — гэта тое ж адлюстраванне рэчаіснасці. Яго тэмп, рыфму таксама можна знайсці ў звычайным жыцці.

*Все по-иному теперь понимается:*
*Все мы конечны, а жизнь не кончается.*
*Ждет нас, как божее благословение,*
*Стихотворение… Тихотворение…*

Міхаіл Пазнякоў у нізцы «Гэтая звонкая далячынь» звяртаецца да пейзажнай лірыкі, якая, па меркаванні аўтара, адзіная здольна адлюстраваць сапраўдныя эмоцыі і пачуцці. Кожны чалавек мае на зямлі месца, дзе ён можа ўздыхнуць з палёгкай, адпачыць ад «фальшывых каштоўнасцей і хлусні»… Гэтае месца — сапраўдны партал часу, які можа вярнуць у дзяцінства хоць і на невялічкі тэрмін. Паэзія Міхаіла Пазнякова — настальгія па мінулых днях, меланхалічныя разважанні, якія падводзяць вынікі ўсяго жыцця. Сімвалічныя тэмы, што знаходзяцца па-за часам і прасторай, вельмі падыходзяць для завяршэння складанага і насычанага года.

*И поныне являются в утренних снах*
*Те года, что сквозь жизнь проступают упрямо.*
*Эта звонкая даль… Этот светлый распах…*
*Эта с хлебом в руках синеокая мама.*

Зімовую тэму раскрываюць вершаваныя цыклы Дар'і Дарошкі «Сэрца зімы» і Рамана Айзенштата «Я веру, веру: гэта снег». У паэзіі творцаў — зіма, па якой сумуюць у гэтым годзе ўсе беларусы. Снежная, марозная, з прыгожымі ўзорамі на вокнах і непаўторнымі сняжынкамі, якія адразу растаюць на далонях. Хоць аўтараў і аб'ядноўвае агульная тэма, раскрываюць яны яе па-рознаму. Дар'я Дарошка праз холад і шэрасць зімовых дзён паказвае ўнутраную адзіноту, смутак па марах, якія не збыліся, страх сустрэцца з чымсьці новым. Пісьменніца разважае пра месца чалавека ў Сусвеце, яго прызначэнне, місію… Зіма паўстае не прыгожай парой, а часам суму, калі замярзае ўсё, нават чалавечае сэрца.

*Надоела зима, надоели морозы,*
*Надоела январская белая стынь.*
*Я хочу инфантильности нежной мимозы,*
*Я хочу похотливости солнечных дынь!*
*Истекай из стекла, поседевшая вьюга!*
*Испаряйся из глаз, льдистый морок души!*
*Ускользни из-под власти предельности круга —*
*Ну, давай же, зима, хоть на что-то решись!*




Раман Айзенштат выкарыстоўвае вобраз зімы як магчымасць змяніць жыццё, пачаць з чыстага, як снег, аркуша. Абнуляюцца ўсе поспехі і няўдачы, гора і шчасце. Паэт, як і яго калега Міхаіл Пазнякоў, звяртаецца да прыроды — найлепшага спосабу адлюстраваць змены не толькі ў свеце, але і ў жыцці чалавека. Не абышлося і без кахання, якое ў сцюдзёную зімовую пару напоўнена асаблівай пяшчотай і цеплынёй.

*Как выжил я, никто не знает,*
*Да стоит ли об этом вслух?*
*Снег на твоих ресницах тает,*
*От белых не отбиться мух.*
*А у меня глаза сухие.*
*Я верю, верю: это снег!*
*Пусть мы с тобой немолодые,*
*Но впереди ведь целый век.*

Проза снежаньскага нумара падыходзіць для сямейнага чытання. Амаль у кожным творы — адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, самыя прыемныя ўспаміны дзяцінства і юнацтва, сапраўдныя каштоўнасці, якія закладваюцца ў сям'і. Пачынае «сямейную» нёманскую сагу «Чырвоны мост» Навума Гальпяровіча (пераклад з беларускай Алега Ждана-Пушкіна). У творы кальцавая кампазіцыя, якая пачынаецца з апісання роднага горада літаратара і заканчваецца тым жа, паказваючы кругаварот жыццёвых падзей і імкненне чалавека вяртацца да вытокаў. Пісьменнік дзеліцца цікавымі гісторыямі з дзяцінства і дарослага жыцця, аб'яднанымі тэмай мужчынскага сяброўства. Аўтар расказвае пра свой пошук сапраўдных сяброў, доўгі шлях да шчырых эмоцый і ўзаемнага даверу. Як пазначана ў пачатку твора, імёны герояў зменены, але сама гісторыя цалкам адпавядае рэчаіснасці. Аповед ідзе ад першай асобы, што ўзмацняе давер да прыведзеных фактаў. У храналагічнай паслядоўнасці — ад дзяцінства да сённяшняга дня — пісьменнік расказвае адразу тры жыццёвыя гісторыі. Спачатку здаецца, што гэта лёгкі ды іранічны твор, аднак паступова апавяданне набывае драматычныя рысы. Гэта ўніверсальная гісторыя, у якой пісьменнік закранае і тэму юнацкага кахання, і першыя сур'ёзныя спрэчкі з сябрамі ды бацькамі, і першы вопыт страты, расказвае пра няўдачы і поспехі. Многія чытачы змогуць знайсці сябе ў пэўных сітуацыях, учынках і эмоцыях.

Апавяданне Валянціны Драбышэўскай «Рыбін тлушч» — пра маленькага хлопчыка Санька, які доўга хварэў і з-за гэтага павінен быў прымаць рыбін тлушч. Як і кожнаму савецкаму дзіцяці (падзеі адбываюцца ў 60-я гады мінулага стагоддзя), Саньку не падабаліся такія лекі, але бабуля знайшла падыход да капрызнага ўнука. Маці Санькі жыла і працавала ў горадзе, таму рэдка прыязджала ў вёску да сына. Бабуля паабяцала, што матуля прыедзе, калі Санька будзе піць рыбін тлушч. З таго часу прайшло шмат дзён, хлопчык даўно перамог хваробу, але маці ўсё не ехала. Кранальная гісторыя раскрывае тонкасці ўзаемаадносін дзяцей і бацькоў, паказвае шчырасць і наіўнасць дзіцячага сэрца. Горкі рыбін тлушч стаў супярэчлівым сімвалам аб'яднання, надзеі і любові. Апавяданне таксама падзелена на дзве часткі: яркая падзея ў дзяцінстве і яе наступствы ў дарослым жыцці. Здаецца, што гісторыя завяршаецца сумна, аднак пісьменніца праз вобраз анёла паказвае: сувязі з мінулым ніколі не страчваюцца.

Тэму страты і аднаўлення распрацоўвае ў апавяданні «Белая галубка» Таццяна Цвірка. Галоўная гераіня Дамініка прадае хату маці, дзе яна таксама жыла ў дзяцінстве. Дзяўчына не можа вяртацца ў вёску без болю ў сэрцы. Свайго бацьку Дамініка ніколі не бачыла. Матуля абяцала расказаць пра яго, калі дачка будзе выходзіць замуж, але не дачакалася. Яна пакінула Дамініку з гэтай загадкай адзін на адзін, аднак містыка і ўнутраная ўпэўненасць гераіні дапамаглі знайсці адказ на пытанне, якое не давала спакою шмат гадоў.

Другое апавяданне пісьменніцы раскрывае ўзаемаадносіны мужа і жонкі. Банальныя спрэчкі пра грошы, заробак і фінансавую адказнасць, якія гучаць амаль у кожнай сям'і, у гэтым выпадку становяцца адпраўным пунктам для паразумення паміж парай. Антон нарэшце зразумеў пачуцці сваёй каханай, аднак для гэтага яму спатрэбілася не адна спрэчка і шчырая размова з суседам Віцькам. Твор напоўнены лёгкім гумарам, які цесна пераплецены з заўсёды актуальнымі сямейна-бытавымі пытаннямі. Іранічнае апавяданне прыўносіць спакой і лёгкасць у насычаны эмоцыямі снежаньскі «Нёман».

Завяршэнне аповесці Наталлі Канстанцінавай «Зазірні мне ў душу» здаецца больш эмацыянальна напружаным, месцамі нават жорсткім для саміх герояў апавядання. Гэта шматгранная гісторыя, якая закранае важныя грамадскія праблемы, міжасабовыя адносіны і ўнутраныя канфлікты. Аповесць уражвае паваротамі сюжэта, зменамі ў характарах герояў, нечаканымі падзеямі. Псіхолаг Насця, якая так старалася стварыць утульную і бяспечную прастору для ўсіх дзяцей у школе, зрабіла памылку (а можа, гэта не яе віна?). А, як вядома, памылкі ў гэтай сферы не дазваляюцца. Насця расчаравалася ў сабе, у сваіх прафесійных якасцях, і гэтае расчараванне было мацнейшае за астатнія пачуцці. Аўтар добра перадае эмацыянальны стан герояў, іх унутраныя перажыванні. Наталля Канстанцінава апісвае не толькі перажыванні канкрэтных персанажаў — пісьменніца закранае і глабальныя праблемы, якія могуць датычыцца многіх. Няўпэўненая, нелюбімая сям'ёй і равеснікамі школьніца Каця знайшла падтрымку ў дарослых мужчын (як яна тады думала). Аўтар раскрывае стыгматызаваную праблему прастытуцыі, прычынамі якой з'яўляюцца выключэнне чалавека з грамадства, дрэнныя адносіны ў сям'і і нянавісць да сябе. Псіхалагічны, моцны і цікавы твор дастойны быць у спісе пазакласнага чытання, каб настаўнікі і вучні, ды і іншыя людзі пачалі больш уважліва сачыць за сваім псіхалагічным станам, сваіх сяброў, калег, сваякоў. Хацелася б больш раскрытай канцоўкі, аднак гэта не псуе агульнага ўражання ад аповесці.

Упершыню ў «Нёмане» апавяданні Івана Мельнікава «Мяне завуць Канда», «Знікненне Лайла Цыльке» і «Шафа». Першыя дзве гісторыі пераносяць чытача на Далёкі Усход. Аўтар спрабуе стварыць таямнічую атмасферу, перадаць цікавыя аспекты замежнай культуры. Аднак, на наш суб'ектыўны погляд, самым цікавым творам пісьменніка з'яўляецца «Шафа». Тут пераплецены цёплыя чалавечыя стасункі з неверагоднымі містычнымі падзеямі. Аўтар любіць дадаць чараўніцтва ў простую шэрую рэчаіснасць. Апавяданне з адкрытым фіналам і вельмі моцным філасофскім падтэкстам, які не кожнаму спадабаецца, аднак сапраўдныя аматары фэнтэзі высока ацэняць падыход пісьменніка.

Рубрыка «Дакументы. Нататкі. Успаміны» парадуе чытача цікавым матэрыялам Міколы Труса «Ад Адама і Марыі: генеалогія творчага прызнання Максіма Багдановіча». Артыкул змяшчае фотаздымкі з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Аўтар спасылаецца як на сучасныя даследаванні, так і на матэрыялы XIX—XX стагоддзяў. Сярод даследчыкаў — бацька паэта Адам Багдановіч, этнограф Расійскай імперыі Міхаіл Дзмітрыеў, Алесь Бачыла з апавяданнем «Дарогамі Максіма Багдановіча» і інш.

Сёння даследчыкаў цікавіць не толькі генеалагічнае дрэва сям'і Багдановічаў, але і пошук невядомых твораў. Вялікае значэнне маюць дакументы, якія дазваляюць рэканструяваць светапогляд, спосаб мыслення герояў.

***Проза снежаньскага нумара падыходзіць для сямейнага чытання. Амаль у кожным творы — адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, самыя прыемныя ўспаміны дзяцінства і юнацтва, сапраўдныя каштоўнасці, якія закладваюцца ў сям'і. Пачынае «сямейную» нёманскую сагу «Чырвоны мост» Навума Гальпяровіча (пераклад з беларускай Алега Ждана-Пушкіна). <...> Спачатку здаецца, што гэта лёгкі ды іранічны твор, аднак паступова апавяданне набывае драматычныя рысы. Гэта ўніверсальная гісторыя, у якой пісьменнік закранае і тэму юнацкага кахання, і першыя сур'ёзныя спрэчкі з сябрамі ды бацькамі, і першы вопыт страты, расказвае пра няўдачы і поспехі. Многія чытачы змогуць знайсці сябе ў пэўных сітуацыях, учынках і эмоцыях.***

«Літаратурная садружнасць» знаёміць з тонкасцямі перакладу. Аўтары артыкула «Казахская проза на беларускай мове: праблема перакладу і межы неперакладальнага» — Алесь Карлюкевіч і Святлана Ананьева. «Беларускае і казахскае мастацкае слова шырока вядомы ў сусветнай прасторы. У развіцці казахска-беларускіх культурных узаемаадносін захоўваецца пераемнасць традыцый. Сучасныя аўтары Беларусі і Казахстана мадэрнізуюць мастацкія тэксты, напаўняюць іх разважаннямі пра рэчаіснасць, філасофскімі роздумамі. Літаратуразнаўцы Казахстана ўводзяць у навуковы абарот новыя матэрыялы, даследуюць сучасны літаратурны працэс, актыўна ўключаючы яго ў кантэкст сусветнага развіцця…»

У завяршэнні снежаньскага «Нёмана» — рэцэнзія Вольгі Русілка на кнігу Віктара Шніпа «Нататнік для паэзіі». «Перад намі паэтычны дзённік, дзе кожны верш адзначаны датай напісання ("ад рукі" паэта, што стварае эфект сапраўднасці і датычнасці чытача)».

Зіма яшчэ не скончылася, аднак дванаццаты нумар «Нёмана» можа зрабіць яе больш утульнай, не такой шэрай і самотнай.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

# Блізкае і ад таго балючае

**Кожны чалавек, магчыма, хоць раз у жыцці сутракаўся з чымсьці паранармальным, з тым, што нельга зразумець і растлумачыць. Усе рэагуюць на такое па-рознаму: хтосьці забывае як дзіўны сон, іншыя спісваюць на стомленасць, а некаторыя ідуць шукаць адказы ў вядзьмарак… Містыка ў аповесці Валянціны Быстрымовіч «Тупат мяккіх лапак» іграе важную ролю, але ці можна назваць твор містычным? Будзем разбірацца.**

З гэтым творам пісьменніца перамагла ў IV Рэспубліканскім літаратурным стартапе «ЛітUP». Кніга выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда» ў 2024 годзе. У цэнтры аповеду — жыццёвыя выпрабаванні простай савецкай дзяўчынкі Ніны, лёс якой не багаты на шчаслівыя моманты. Развод бацькоў, адзіноцтва ў пустой хаце, сваркі з маці і айчымам… Шлюб з каханым абяцаў быць шчаслівым, але, як гэта часта бывае, наіўная дзяўчынка ўбачыла сапраўднае аблічча мужа толькі пасля вяселля. Ніна выбірае пакутаваць і спадзявацца на лепшае. Аднак нічога не мяняецца, акрамя ўзросту.




Чытач можа запытацца: што ж тут паранармальнага? Звычайная гісторыя сярэднестатыстычнай жанчыны не толькі савецкіх часоў, але і сучаснасці. Але містыка суправаджае гераіню з першых старонак, накіроўвае яе жыццё і ўладарыць над яе асобай. Аматара фэнтэзі — вампіраў, ваўкалакаў і іншых міфічных істот — твор можа здацца занадта рэалістычным. Сапраўды, тут ідзе размова пра містыку «побытавую» і прыземленую. Сурокі, замовы, праклёны, дзіўныя знакі, размовы з з варажбіткамі ствараюць таямнічую і жудасную атмасферу. Твор не пра містыку, а пра звычайнае жыццё, якое існуе на мяжы рэальнасці і фантастыкі, пра вечнае жаданне чалавека знайсці адказы на ўсе пытанні і зразумець незвычайнае.

Ніна — вельмі супярэчлівая гераіня. На першы погляд, яна дужая і смелая жанчына, якая, негледзячы на жыццёвыя выпрабаванні, змагла пераехаць у сталіцу, атрымаць вышэйшую адукацыю і нарадзіць дзвюх цудоўных дачок. З іншага боку, яна нешчаслівая ў шлюбе, але застаецца з жорсткім і легкадумным мужам, які не паважае ні яе, ні дзяцей.

Пісьменніца добра адлюстроўвае духоўны стан гераіні, яе разважанні, сумненні, пачуцці. Магчыма, з-за таго, што многія з'явы паказаны вачыма Ніны, у чытача ўзнікае дысананс паміж учынкамі персанажаў і іх апісаннем. Тое, што нельга апраўдаць, тут падаецца як звычайная памылка, якую можа зрабіць кожны. У творы няма відавочных антаганістаў, але дзеянні кажуць за сябе самі. Аўтар робіць акцэнт на тым, што ў жыцці няма чорнага і белага, усіх можна зразумець, усё можна дараваць.

Структура аповесці дапамагае чытачу паглыбіцца ў няпростыя сюжэтныя перапляценні. Кальцавая кампазіцыя пачынаецца з сучаснасці, дзе Ніна ўжо дарослая жанчына з багатым жыццёвым досведам, у якім больш гора і пакут, чым радасці і шчасця. Гераіня сустракае варажбітку Ніку, і тая прапаноўвае адказаць жанчыне на ўсе пытанні. Ніна спрабуе ўспомніць, калі пачаліся яе праблемы, і чытач паступова знаёміцца з лёсам жанчыны. Пачынаючы з дзяцінства, праз юнацтва, маладосць і зноў да сучаснасці. Кожную главу аповесці можна разглядаць як асобнае павучальнае апавяданне, дзе пісьменніца ўздымае праблемы маралі, складанага лёсавызначальнага выбару, абмежаваных магчымасцей, непаразумення паміж блізкімі. Аўтар выкарыстоўвае дастаткова распаўсюджаны ў містычных гісторыях сімвал — прарочы сон. Яго таксама можна назваць важнай структурнай адзінкай аповесці: з прарочага сну пачынаецца гісторыя Ніны, і ён жа ставіць кропку (ці коску) у жыццёвых выпрабаваннях гераіні. Чытача чакае адкрыты фінал, але, у адрозненне ад мінулага, будучыня абяцае быць шчаслівай.

Стыль Валянціны Быстрымовіч, як заяўлена ў анатацыі, набліжаны да гутарковага, аднак часам узнікае адчуванне штучнасці. Гэта можна звязаць з абранай формай апавядання. Расповед ідзе ад трэцяй асобы, аднак пачуцці, эмоцыі і разважанні гераіні адлюстраваны занадта падрабязна.

Кніга «Тупат мяккіх лапак» падыходзіць для чытачоў сярэдняга ўзросту, якія заспелі «перабудову», памятаюць атмасферу тых часоў і настрой грамадства. Сюжэт аповесці нельга назваць класічным, які падыходзіць пад пэўны настрой ці сітуацыю. Цікавая гісторыя жыцця, у якой хтосьці можа знайсці нешта блізкае для сябе. Гэтая кніга пра супярэчлівасць нашага свету і чалавецтва, пра побытавыя цяжкасці, якія ўплываюць на ўсё жыццё, пра вельмі блізкае і ад таго балючае — балючае сваёй шчырасцю…

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**

# Прывабныя назвы і сюжэты

**Праблемы маральнага, працоўнага, сямейнага выхавання дзіцяці ва ўсе часы знаходзіліся ў полі зроку бацькоў, педагогаў, псіхолагаў і дзіцячых пісьменнікаў. У сучасным грамадстве выхаванне найлепшых рыс і якасцей асобы дзіцяці сродкамі літаратуры таксама мае вялікую актуальнасць. Кніга апавяданняў Тамары Бунта «Далонькі з пушынкамі», якая выйшла ў 2024 годзе ў выдавецтве «Адукацыя і выхаванне», мае вялікі педагагічны патэнцыял. Напісаная мовай, зразумелай маленькім чытачам, кніга дазваляе стварыць далікатныя выхаваўчыя сітуацыі, зразумець прычынна-выніковыя сувязі паводзін герояў, навучыцца разумець важнасць і каштоўнасць станоўчага прыкладу бацькоў у штодзенным жыцці.**

У змесце і пабудове твораў аўтар улічвае псіхалагічныя асаблівасці дзяцей — чытачоў гэтай кнігі. Прывабныя назвы апавяданняў («Далонькі з пушынкамі», «Цудамайстры», «Адзін дома», «Рукавічка з сюрпрызам» і інш.) яшчэ да чытання запрашаюць маленькіх чытачоў паразважаць, пра што пойдзе размова, узмацняюць цікавасць да кнігі. Яскравыя, зразумелыя дзецям прыклады з жыцця, якія сталі сюжэтам кожнага апавядання, утрымліваюць у сабе пэўную праблемную сітуацыю, дэманструюць варыянты іх паспяховага вырашэння з улікам індывідуальнага падыходу да дзіцяці. Гэты аспект дазваляе адзначыць, што кніга апавяданняў Тамары Бунта «Далонькі з пушынкамі» мае каштоўнасць не толькі для арганізацыі чытання яе вучнямі на ўроках літаратурнага чытання, але і для выкарыстання кнігі ў пазавучэбнай дзейнасці (на тэматычных класных гадзінах, факультатыўных і гуртковых занятках літаратурна-творчай і выхаваўчай накіраванасці і інш.), кніга можа быць рэкамендавана і для сямейнага чытання.

Нельга не адзначыць маляўнічае, добра прадуманае афармленне кнігі (мастак — Аксана Аракчэева), што з'яўляецца вельмі важным для паўнавартаснага ўспрымання зместу і галоўнай думкі твораў чытачамі малодшага школьнага ўзросту.




Такім чынам, кніга Тамары Бунта ўяўляе сабой узор сучаснай якаснай, добра ілюстраванай кнігі для дзяцей, якае мае літаратурную, мастацка-эстэтычную, педагагічную каштоўнасць і можа з поспехам выкарыстоўвацца для арганізацыі чытацкай дзейнасці дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

**Ірына БУТОРЫНА**



## Чытацкі дзённік Навума Гальпяровіча

# Слухаючы душу

Памятаю першае ўражанне ад кнігі вершаў Алеся Бадака «Будзень», што ўбачыла свет у 1989 годзе, калі свежасцю і вобразнасцю прыцягнулі найперш радкі:

*Жывуць у небе змалку*
*На леціцшчы вятроў —*
*Сястра мая маланка*
*І сумны брат мой гром.*

*Там холад і пустэча,*
*І ціш ва ўсіх канцах.*
*І цьмяна зорак свечкі*
*Там свецяць па начах.*

Тады, у канцы васьмідзясятых, чытачоў парадавалі новыя імёны — прыходзіла маладзейшае пакаленне творцаў са сваім адметным почыркам і поглядам на рэчаіснасць.

Звычайныя для маладой паэзіі тэмы і вобразы ў Алеся Бадака былі напоўнены шчырай душой аўтара, нешматслоўнасцю, якая давала прастору думцы, падштурхоўвала асэнсаваць з'явы, здаецца, простыя і звычайныя, але якія ў аўтара набывалі сваё, адметнае гучанне.

Гэтая ўласцівасць таленту, якая праявілася ў першай кніжцы, працягнулася і ў другой «За ценем самотнага сонца», што выйшла аж праз шэсць гадоў пасля першай. Забягаючы наперад, скажу, што ў адрозненне ад калег і равеснікаў паэт не спяшаўся з выхадам кніг.

Увогуле, для Алеся Бадака і ў паэзіі, і ў прозе, пра што я пісаў раней, уласціва высокая патрабавальнасць да ўласнага слова, карпатлівае габляванне ўласных радкоў, што можна ўбачыць і ў зборніку «Уладар ветру», які не так даўно пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».

У невялікай па памеры кнізе сабраны вершы з пяці папярэдніх зборнікаў, па якіх можна прасачыць духоўны і творчы шлях аўтара:

*Сыходзіць паэзія з вечных вышынь,*
*Дзе сонцам прасвечвае слова.*
*Сыходзіць паэзія ціха з душы,*
*І слепне душа паступова.*

*Вядома, на ёй не канчаецца свет*
*І не апусцеюць вышыні.*
*І скажа разумны:*
*— Такі цяпер век.*
*А мудры:*
*— Нічога не згіне.*

*Разумны дадасць:*
*— У эпохі любой*
*Куміры свае на прыкмеце.*
*А мудры запэўніць:*
*— Заўсёды травой*
*Трава вырастае на свеце.*

Сумна? Сумна. Трывожна? Трывожна.

Але гэтыя сум і трывога — і ўнутраная нязгода, і надзея, бо паэзія вечная і ёй, спадзяюся, непадуладныя ўсе пасткі тэхнічнага прагрэсу і людской абыякавасці.

І як доказ трываласці і веры:

*— Мора ёсць! — прашэпча ў цішыні.*
*«Мора ёсць» — падхопіць словы вецер.*
*Над зямлёй, у светлай вышыні,*
*Разнясе іх тут жа сам па свеце.*

Гэтак жа і з паэзіяй. Як беларускае Мора Герадота з верша, так і паэзія, у якой «нарастаюць шум і галасы», пра што сведчыць творчасць майго сучасніка і таварыша.

А ўсё несапраўднае, няшчырае сплыве як крыгі пасля доўгай зімы.



Змітрок МАРОЗАЎ

# З няспаленых чарнавікоў

Паэту-франтавіку Аляксею Пысіну і Яўгеніі Янішчыц ад удзячнага вучня.

* * *

*Жыву ў стагоддзі перуновым,*
*Штодня з людзьмі і для людзей,*
*І кожны будзень мой вясновы —*
*У эпіцэнтры ўсіх падзей.*

*Здаецца, што для шчасця трэба?*
*Зямныя клопаты з табой,*
*Ёсць хлеб сумленны і да хлеба,*
*І неба звон над галавой.*

*Жыві і радуйся!.. Ды бачу*
*Ў тэлеэкраннай мітульзе —*
*На мацярык наш спрут лядашчы*
*З пагрозай жудаснай паўзе.*

*З радкоў, што мне народ мой дорыць,*
*З калоссяў — нелюдзям заслон…*
*Грымотны час не ператорыць*
*Зямлю ў маўклівы пантэон.*

## Бацька

*(дыптых)*

**1.**

*Свет без бацькі збяднеў напалову,*
*Прад якім я ў бясконцым даўгу…*
*Дзе знайсці запаветныя словы,*
*Каб сусешыць матулі тугу?*

*Я прыйду на бацькоўскае поле,*
*Кіну жменю жытнёвых зярнят,*
*Ды яно здрыганецца ад болю*
*І адрыне насенне назад.*

**2.**

*Густыя лютаўскія ветры*
*Кладзішча снегам замялі.*
*Паміж табой і мной — два метры*
*Слязьмі спатоленай зямлі.*

*Паміж табой і мной так многа*
*Жыццёвых радасцей і бед…*
*Табе — спакой, а мне — дарога*
*Не ад цябе, а да цябе.*

## Сустрэча

*Сустрэў я ў цемры незнаёмца*
*І размінуўся з ім без слоў…*
*І доўга шчэ насустрач сонцу*
*Пустэльным шляхам я ішоў.*

*Аб той сустрэчы выпадковай*
*Я думаў з нейкаю віной —*
*Мо нам хапіла б толькі слова,*
*Каб стаць сярод начы раднёй?*

* * *

*Калі верных сяброў нестае,*
*Не ўратуюць багацце і слава,*
*Давяраю пачуцці свае*
*Я тады разняволеным травам.*

*Чыстацел — ачышчэнне душы,*
*Курасле́п — слепату праганяе,*
*А палын ля апошняй мяжы*
*Песні долі маёй залюляе.*

* * *

*Спячы луг пад росным сейвам стыне,*
*Гаснуць знічкі ў зябкай вышыні.*
*І цвыркун — мясцовы Паганіні —*
*Скрыпачку спрабуе ў цішыні.*

*Асцярожна, шчыра. Без прынукі*
*Ён кранае струны дабрыні, —*
*І на свет вылузваюцца гукі*
*З таямніц прыроды, з глыбіні.*

*Колькі ў іх нязмушанай і шчырай*
*Чысціні, пяшчоты адкрыцця!..*
*Счараваны цвыркуновай лірай,*
*Раптам я заплакаў, як дзіця.*

* * *

*Вечар. Ветах. Вецер.*
*Хатаў чуйны сон.*
*Адлятае квецень*
*З яблыневых крон.*

*Дзесь зайграў гармонік*
*І заціх зусім,*
*На тваёй далоні —*
*Ад пялёсткаў дым.*

*Час апошняй стрэчы,*
*Задуменны сад…*
*Вечар. Ветах. Вецер.*
*Быццам век назад.*

* * *

*Шукае выйсця слова,*
*Як берагу рака,*
*Жыву адначасова*
*Я ў некалькіх вяках.*

*Але ж і я не вечны,*
*Таму і клопат мой —*
*Аб слове чалавечным,*
*Аб памяці людской.*

## Старая сасна

*Ля Крупак бары, як арганы,*
*Глыбока і глуха гудуць.*
*Старыя акопы, як раны,*
*Падлескам расці не даюць.*

*За бруствер збуцвелы ў адхаі*
*Чапляецца прагна сасна,*
*Вятрыска яе расхістае —*
*Арганная лопне струна.*

*Збяднее мелодыя бору.*
*І птаства паплача па ёй —*
*Зямной субяседніцай зораў,*
*Хрышчонай мінулай вайной.*

* * *

*У наступнай вайне пераможцаў не будзе*
*І жыццё не пачнецца з нуля,*
*Не паставяць крыжа «іншаземныя людзі»*
*Чалавецтву планеты Зямля.*

*Рэха выбуху будзе ў Сусвеце насіцца,*
*Сны галактык чужых турбаваць…*
*Мне не спіцца, і небу чамусьці не спіцца,*
*Знічкі гаснуць і ў сэрца ляцяць.*



Настасся НАРЭЙКА

## Варажыць і служыць

*(дыптых)*

**1.**

*Кожны дзень — як маленькая вечнасць.*
*І думкі — як храм.*
*Ты хаця б уяві, як жа МНОГА*
*Тут дадзена нам!*
*Ты спыніся хаця б прад адной*
*З разнасцежаных брам.*
*Ты хаця б зразумей...*
*Я нікому цябе не аддам.*

*Кожны дзень — як экзамен.*
*Білетаў не бачыў ніхто.*
*Кожны дзень мы выходзім з піке*
*На бяздушша плато...*
*Кожны дзень мы скідаем*
*Пад вечар, нібы паліто.*
*Ты — адценне маё. Ну а я?*
*Ну а я тады хто?*

*Кожны дзень — паварот*
*(Ці апошні?) старога ключа.*
*Не скідай, калі ласка, рукі,*
*Нібы крылаў, з пляча...*
*Я згараю. Не аркуш, не дом,*
*Я — малая свяча.*
*І твой боль я вазьму,*
*Калі лёс загадае: «Маўчаць!»*

*Кожны дзень прадчуваю твой голас,*
*Дыханне і крок.*
*Адчуваю цябе праз сцяну,*
*Праз маўчанне і змрок.*
*Я цябе не аддам.*
*Пасміхаецца горасны рок.*
*Ты дарма.*
*Я засвоіла добра мінулага ўрок.*

*Я яго не аддам.*
*Я сама вечнай слабасці знак.*
*Я згару, я рассыплюся ў пыл,*
*Калі трэба. Хай так!*
*Кожны дзень — як маленькая вечнасць,*
*Вада і праснак.*
*Ён — мой боль.*
*Мой адчай.*
*Мой спакой.*
*Без яго мне — ніяк.*

**2.**

*У тваім неспакойным дыханні я чую — мора.*
*— Я хворы?*
*— О, не, мілы мой, ты ніколькі не хворы...*
*Гэта вецер ляціць, закранаючы крыламі горы,*
*Гэта месяц плыве, разганяючы вёсламі зоры, —*
*Што заўгодна! А з раны гарачая кроў не бяжыць.*

*У тваіх пачарнелых вачах я адгадваю — хмары.*
*— Я гару?*
*— Мілы мой, гэта морак, пажары і мары.*
*Ты даўно пра агонь ачышчальны маліўся і марыў.*
*Ты даўно нада мной і над гэтай зямлёй уладарыў.*
*Ты — мой князь. І не маеш маральнага права не жыць!*

*Падступае да нашага горада вечнае мора.*
*— Гэта гора...*
*— Не гора, а горад! Твой велічны горад!*
*Ты павінен устаць, мой магутны, мой казачны волат!*
*Ты павінен устаць, покуль ночы апусціцца холад!*
*А тады прыйдзе час для мяне — варажыць і служыць.*



Алена КОТАВА

## Дачушка буслінай зямлі

*Я — дачушка буслінай зямлі,*
*Што прыгожа завуць Беларуссю.*
*Тут спрадвеку ў пашане былі*
*На стале ільняныя абрусы,*
*Тут напоіць вясною мяне*
*Сокам смачным бярозка на ўзлеску.*
*Тут жаўрук тонка, чыста пяе*
*Сваю добрую гожую песню.*

*Тут чаромхавы водар плыве,*
*Абуджаецца сэрца язмінам,*
*Тут народ працавіты жыве,*
*Што Купалавым словам адзіны.*

* * *

*А недзе завіруха за акном*
*Лагодна грала новую сюіту,*
*Ды маладзік на небе слухачом*
*Слаў на зямлю самотныя флюіды.*

*Мелодыя гучала сумна так:*
*Жалобныя, маркотныя ў ёй ноты.*
*І толькі месяц ацаніў той такт,*
*Бо звыклы ён да вечнай адзіноты.*

* * *

*А пень маўкліва назіраў,*
*Як ажывае ўсё з вясною.*
*Глядзеў і моцна сумаваў*
*Ды размаўляў з самім сабою.*

*— Хацеў бы зноўку я займець*
*І завушніцы, і лістоту,*
*Хацеў бы з ветрыкам шумець,*
*А ўвосень — мець бы пазалоту.*
*Хацеў бы сокам напаіць,*
*Здароўя надаваць ды сілы.*
*Шкада, бярозкай больш не быць,*
*Не быць, шкада, паэту мілай.*

*І пень у суме назіраў,*
*Як расцвітае ўсё вясною.*
*Ды што патрапіў ён — не знаў —*
*У мілагучны верш са мною.*

* * *

*Як можна здрадзіць Беларусі,*
*Яе бярозавым гаям*
*І хлебу на льняным абрусе*
*Ды салавейкавым начам?*

*Як можна здрадзіць васільковай,*
*Буслінай, матчынай зямлі?*
*Як можна здрадзіць родным словам,*
*Што ў мове прашчураў жылі?*

*Як можна знішчыць памяць дзедаў?*
*Як неба роднае прадаць?*
*Маіх мне не хапае ведаў,*
*Каб гэту здраду апраўдаць.*

* * *

*Расцвітае край, расцвітае,*
*І духмяны водар плыве.*
*Асцярожна вясна ступае*
*Ды пяшчоту ў руках нясе.*

*Стаў нявестай мой край, нявестай,*
*Прыгажуняй раптоўна стаў,*
*Бавіць сэрца вясельнай песняй,*
*Што музыка з нябёс сыграў.*

*Расцвітае край, расцвітае*
*У пяшчотных фарбах вясной*
*Ды надзеяй жыццё акрыляе,*
*Дорыць лад і ў душы спакой.*



Фёдар ГУРЫНОВІЧ

# «Здаецца, учора ўсё было...»

*Мініяцюры*

* * *

Прыпякло сонца, і парыць стала, і закучаравіліся шызымі дымкамі палеткі, і затрымцела над імі лёгкае марыва. І здалося, што гэта ажыла і загайдалася прагрэтая далеч. А ў беразаку зіма прыкметная яшчэ, але ствалы дрэў абапрэлі, вакол іх снег пранасіўся, як старая апратка, агаліўшы зелянковы бруснічнік і ломкі, быццам закасцянелая на марозе лаза, верас.

Бязладнае снежнае лахмоцце раскіселілася, разапрэла, і цёплая жыжка перастала шэрхаць пад нагамі, і, страсянуўшы ваколле тысячакрылым сінім усплёскам, з бярозавага рэдкалесся ўзняліся ў паветра клінтухі[1], якія ў самым пачатку сакавіка прыляцелі на радзіму.

* * *

Пад акном нашай рэдакцыі чырванее рабіна з падмарожанымі гронкамі, яе аблюбавала чародка снегіроў. Самцы — у ярка-малінавых камізэльках, снегірушкі — у адзенні больш сціплым — колеру какавы. Скок-скок ад ягадкі да ягадкі — без мітусні, без спрэчак. І толькі ўдзячнае, лагоднае «ценьцень» будзіць звонкую цішыню студзеньскага поўдня.

— Ой! — ускліквае машыністка Таццяна. — Адной снягурцы сябра не хапае: чырвоненькіх сем, а шэранькіх восем.

А праз месяц заціўкалі капяжы, і снегіры не прыляцелі, хаця ягад на рабіне засталося шмат. І стала не хапаць сумнаватага меладычнага звону. Чамусьці думаецца, што на поўначы, куды адляцелі снегіры, іх песенькі гучаць больш весела, бо там яны спраўляюць вяселлі, будуюць гнёзды, выводзяць птушанят. Упэўнены, што і шэранькая, па вызначэнні Таццяны, знайшла сабе пару і выседзела малінавагрудых снегірковў.

* * *

Над балотам румянілася позняе сонца і, перад тым як умасціцца нанач, танчэйшым золатам лудзіла навакольную цішу. І раптам птушынае рознагалоссе ўзарвала прымоўклую прастору, упіваючыся вячэрняй малітвай.

З глухім цокатам пырхала ў зарасніку шумлівая чаротаўка; пагойдваючыся на свечцы рагозу, конікам стракатала пярэстая пташачка цвыркун; коўзаючыся на хвасце па сухадрэвіне, чыкаў дзятлік у чырвоным берэце; дзікавата квахтаў мітуслівы шэры дрозд. А на адзінокім дубе, што немаведама як ацалеў пасярод балота, змрочна мармытаў вяхір[2]. І, заслаціўшы гэты свіст, чыканне, скрыпенне, наладжваў жалейку салавей.

* * *

Люблю паляўнічую ноч — калі прамень ліхтара, быццам хірургічны скальпель, успорвае цемру, адкрывае таямніцы, калі бачу і чую, чаго не дадзена дзённаму воку. Кожная сцежка прыпадымае завесу, за якой — адкрыццё, хай сабе і зусім маленькае, як, скажам, паляванне вожыка. Вядома ж, вы сустракалі яго і ў лесе, і на агародзе. Такім ён застаўся і ў вашай памяці — спалоханым шарападобным кактусам.

А пабачылі б вы, як лоўка пераварочвае ён даволі цяжкі корч, пад якім схавалася жабка, як выгінаецца ў яго зубках злоўленая гадзюка. Думаю, дарагі чытач, ты не будзеш аспрэчваць таго, што паляванне — занятак інтэлектуальны, а таму людзі, якія ім захапляюцца, ведаюць аб прыродзе ў шмат разоў больш за пасрэдных абывацеляў.

* * *

Лейцы ў свае рукі бра клапатлівы ліпеньскі дзень. Агаляючы сінявата-чорныя далі ад рыхлага туману, з поўдня набег халаднаваты ветрык. Ён стаў гуляцца з мяцёлкамі чароту, і, вызваліўшыся ад расы, яны азваліся стракатым шолахам. У балоце малітоўна зазвінела, затрашчала, зайшлося свістам птушынае асарці, сонна чуфыкнуў цецярук, звонкі горан пранесла над балотам жураўліная пара.

Усё жывое славіла пачатак новага дня.

* * *

Прысланіўшыся да старога дуба на ўскрайку лесу, быццам дыханне старажытных вякоў, слухаў начную музыку лесу. Наўкола шапталіся на толькі ім зразумелай мове дрэвы. Асіна, рассыпаючы трывожнае трымценне, шыпела, як лёгкія хвалі на плыткім плёсе; бяроза лепятала лістотай роўна і аднастайна; клён пляскаў у лісты-далоні, як удзячная зала — артысту; ёлка працэджвала шэпт праз шыпулькі шырокіх лап і ўздыхала; а рабіна церлася галінай аб галіну веерамі вузкаліста з ледзь улоўным прысвістам.

Цемрадзь была таемнай і невытлумачальнай. Насамрэч, калі ў начным лесе не перажываеш казачнай жудасці і радаснага страху адзіноты, то паляванне страчвае трывожнае, захапляльнае зачараванне.

* * *

Даўжэюць ночы і карацеюць дні. Учора грукатаў Ілья, а сёння халаднавата, і ўжо зусім не цягне купацца. Пабурэлы і вусаты, нібы стары бабёр, вострымі асцюкамі колецца ячмень. Цяжкімі і халоднымі сталі росы, а драч так і не навучыў птушанят лётаць. Там, дзе яны шнуруюць па ўзбалотку, сухую альшыну да самай макаўкі абвіў пышны, учэпісты хмель.

Вохрыстым восеньскім апярэннем драчаняты нагадваюць людзям аб тым, што канчаецца гарачае лета.

* * *

Неверагодна! У самым пачатку студзеня, калі чорна-белай графікай зімы заштрыхаваны і дрэвы, і агароджы, і сцены шматпавярховак, раптам дыхнула вясной, і на тратуары палка забуркаваў голуб.

Сівая хмара, як дакучлівы сон, затрымалася над горадам і заклапочана сыпанула ў двор колькі прыгаршчаў дажджу. І рассыпчаты, нібы соль, снег споўз з асфальту на абочыну. З шырокіх вітрын на закураную белату абрынулася сінеча, і самы смелы верабей расплёскаў у лужыне паўдзённае малінавае сонца.

* * *

Быццам на парад, у горад прыехалі хвалістыя хмаркі. Яны аб'ядноўваюцца, выцягваюцца ў шарэнгу, нібыта сапраўды рыхтуюцца маршыраваць па галоўнай плошчы. Калі апошняя, самая доўгая і цёмная, далучаецца да астатніх, пачынаецца дождж. Спачатку ціхі, ён мацнее, у ім блытаюцца рэдкія градзіны, а хвіліны праз тры каскад звонкіх пырскаў пераходзіць у скразны ледзяны гарох. У змятай траве ён серабрыцца, быццам язёвая луска; нібы ў канфеці, пабліскваюць і блакітныя ёлкі.

Над закаханымі парамі ярка ўспыхваюць рознакаляровыя парасоны, але, каб не быць пабітаму, лепш забегчы ў кавярню. Столікі тут занятыя: і моладзь, і сталыя гараджане цягнуць каву з тонкіх кубачкаў. А праз шырокую вітрыну відаць, як босае хлапчо бегае па лужах, збіраючы ў жменю пякучыя градзіны, і спрабуе іх на зуб.

* * *

У дзяцінстве, бывала, вязём з татам сена па лясной дарозе, а папераддзе каня пырхае ўдод — быццам шлях указвае. Пры гэтым ён то распушвае, то складвае франтаваты грэбень. Мабыць, адводзіць ад гнязда нечаканых гасцей.

Пасяляецца ўдод у высокіх дуплах, у старых пакінутых вуллях, у кучах камення. Аднойчы мы знайшлі гняздо ў паўгнілым вуллі-калодзе. Там ляжала высахлае цельца птушаняці. Пазнаць у ім казачна прыгожага птаха можна было хіба што па жаўтаватым рэдкім чубчыку. Загінуў жа ён, хутчэй за ўсё, з-за доўгага воласа з конскай грывы, які птушкі выкарысталі пры будаўніцтве гнязда. У ім і заблыталася ножка маленькага ўдодзіка.

* * *

Націраючы «шышкі» пад крыламі, прагна выцягвалі шыі і шукалі цёплых астраўкоў гусі. Слухаў вырай шмат разоў і ўпэўніваўся, што восеньскі гогат увесь са смутку і тугі, а з поўдня птушкі прастуюць з радасным клічам. Так і на радзінах, і на памінках п'ецца адно і тое ж віно, але за радзінным сталом яно жаданае і салодкае, а ў хаўтурны час — быццам з палыну…

Успомню тых гусей — здаецца, учора ўсё гэта было, здаецца, і не жыў яшчэ на зямлі, а задумкі даўнія здзяйсняць быццам і пазнавата.

* * *

Ахутваючы вёску прывідным ценем, харугвамі хісталіся змрочныя хмары. Гнеўна і раз'юшана дрыжалі нябёсы, сляпучымі пугамі хвасталі сцішанае наваколле маланкі і падалі ў шахты круглых калодзежаў. З даўкім скрыгатам ляскацелі частыя грамы. Кіпучым вадаспадам на вуліцу абрынулася скразная залева, агулам змінаючы зеляніну.

Раз'ятраны дажджыска перайшоў у стукатлівы град, які апантана ўбіваў у глебу ледзяністыя вішні. Стальнымі лбамі сутыкаліся рваныя клубы, высякаючы агонь жудаснай сілы. Навальнічныя разрады, нібы змеі з двайнымі хвастамі, наводмаш паласавалі аглохлую далеч. Як лучыны, ламаў вятрыска голле старэчых таполяў, збіваў з іх шапкі грачыных гнёздаў…

Усё скончылася раптоўна, як і пачалося. Заціх над вуліцай бетонны грукат, праясніліся далі. Засталіся толькі перапоўненыя мутнай вадой лужы, яркая вясёлка ды пашчапаная агнём асмаленая груша.

* * *

Замглёным быў шкляны прастор, і непралазнай была гразь на сяле. Але быў я невыказна шчаслівы ад тваёго пісьма. Прачытаў і пяць, і дзесяць разоў ліст з дарагім почыркам, а пасля ўклаў у кніжку. А назаўтра зноў атрымаў ад цябе пісьмо — шчырае і ласкавае. Зборнік жа з учарашнім лістом заціснуў на паліцу між кніг. Пасля зноў і зноў атрымліваў пяшчотныя, сэрцам чаканыя весткі і, зубрачы філасофію ва ўніверсітэце, зусім забыў пра паэтычны зборнічак з пісьмом між старонкамі.

А гадоў мо праз дваццаць выпадкова напароўся на той забыты ліст і, тоячы дыханне, узяў яго ў рукі і некалькі разоў перачытаў — нібы пагаварыў з далёкім юнацтвам, што азарыла нас вечным каханнем.

* * *

Сумотная ржа апалага лісця, тугая аранжавасць спелай рабіны — шэрае запусценне позняй восені. А краскі яшчэ наіўна спрабуюць квітнець. Раней не тое каб іх не любіў — проста не заўважаў. Адны з іх цвітуць на кладах, іншыя — на абочынах кінутай дарогі. Яны спяшаюцца адкрасаваць і згараюць хутка, як свечкі. І дзіўна, што ў гэткім узросце шаную іх усё больш і больш — мусіць, таму, што цяпер яны цвітуць не ў восеньскім захалусці, а ў маёй душы.

* * *

Яшчэ ў расяным россыпе весела мільгала праменне, а лес ужо вянуў, маркоціўся, шэрхнуў, і заласцістая чашы бяроз напаўняліся прыглушаным, спавядальным шэптам. Цяжарам непатрэбнага грузу асыпалася лістота, і кружыў па ваколіцы дзік, крышачы кукурузу. У цьмяным свячэнні алявянае высі ўгадваліся ноткі горычы, і сонныя вужы звіваліся ў клубок пад струхлелай калодай.

А нейкі, хутчэй за ўсё малады, шпачок страчаючы ў світальным небе свяціла, запеў, засвістаў на ўсе лады, быццам яму не хапіла лета. І пасля вільготнай начной прахалоды на пакатым схіле канавы сузор'і чартапалоху запахлі пяшчотней за майскія ружы.

* * *

Траўкай браліся паплавы, і ў бяздоннай вышыні куляўся дзюбаты бакас. З букетам пралесак па ваколіцы ішла вясна з вачамі рафаэлеўскай мадонны. На ўзбярэжжы азярца рдзеў жвір, малінавым пажарам дагараў красавіцкі дзень.

І раптам у азярыне дружна заспявалі жабы. У страснай непрытомнасці экстазу іх хор абрушыўся, як лавіна з гор. Шмат разоў слухаў жабіныя канцэрты, але такога не чуў. Нібы з вакольных балоцін сышліся лупавокія царэўны, і ад іх зеленаватага свячэння кіпела і пузырылася нагрэтая вада. Яны радаваліся таму, што растаў абрыдлы снег, што нарэшце ўжо настаў час чапляць на водарасці вінаград сваёй ікры…

А бусел радаваўся і вясне, і той вячэры, што сноўдалася побач.

* * *

Непаседлівым свавольнікам абышоў асеннюю ваколіцу вецер, і перад дасвеццем ускрай лугу стаў вымалёўвацца раскідзісты дуб. З лісцем, як медзь, звоністым, ён замаячыў над нізавым туманам, быццам казачны старажытны волат. У ржавых шрамах і рубцах, апалены маланкамі, князь лясной дзяржавы быў яшчэ моцным, што воўчы зуб. Хоць пяць вякоў крочыў праз зграі навальніц і бур, але ў дужасці сваёй мог параўнацца з пушчанскім зубрам. У яго ёсць шанцы несці наканаваны Богам крыж да тысячагоддзя.

Глянеш на магутную крону — і шапка з галавы.

[1] Клінтух — адзін з відаў дзікіх галубоў.
[2] Вяхір — адзін з відаў дзікіх галубоў.

# З зямнога ў вечнае

**23 студзеня раптоўна спынілася сэрца Віктара Гардзея. Пісьменніка, які праявіў сябе ў розных галінах творчасці. Каторы кірунак ні возьмеш — гэта настолькі таленавіта, што нельга не здзіўляцца, наколькі сам Усявышні паклапаціўся, каб хлапчук са звычайнай вясковай сям'і, якая пражывала ў вёсцы Малыя Круговічы Ганцавіцкага раёна, дасягнуў такіх высокіх мастакоўскіх вышынь.**



Фота Кастуся Дробава.

Яго паэзія — настолькі прасветлена-лірычная, што, калі знаёмішся з ёю, уражанне такое, быццам яна ўвабрала ў сябе ўсю пяшчоту Палесся з яго нерушавасцю і багаццем гэтага краю на добрых і шчодрых людзей.

Проза — тая ж лірычнасць, але з філасофскай засяроджанасцю, дзякуючы якой ва ўсёй шматграннасці, непаўторнасці зноў жа спасцігаеш пяшчоту і багацце Палесся і яго жыхароў палешукоў, якія, калі захочуць, любога могуць заткнуць за пояс.

Дзіцячыя творы — такое багацце фантазіі, што ажно дзіву даешся. А яшчэ ж яны прасякнуты тонкім гумарам, які час ад часу высвечваецца дыяментамі-іскрынкамі. Гэтакім жа гумарам, дарэчы, напоўнены і шмат якія празаічныя творы.

Публіцыстыка — нязменная выразнасць жыццёвай пазіцыі. Ён, у параўнанні з іншымі, не быў трыбунам, аднак і маўчуном яго не назавеш: браўся за пяро як публіцыст толькі тады, калі проста не можа не выказаць сваё стаўленне да таго, што адбываецца ў грамадстве.

Пераклады — нязменная павага да аўтара, да арыгінала, але гэта ўменне прыўнесці і сваё, што, не адмаўляючы таленту таго, каго пераўвасабляеш пабеларуску, дае мажлівасць у нечым раскрыцца і ўласнаму таленту.

Бадай, нічога больш дадаваць не трэба. Хіба што падрабязней расказаць пра асобныя набыткі яго ў гэтых жанрах. А яшчэ, хочаш таго ці не хочаш, паколькі слова развітальнае, прыгадаць і некаторыя асабістыя моманты. Звязаныя як з яго жыццём, так і з творчасцю. Найперш — паэтычнай, бо не будзе перабольшаннем сказаць, што ўсё ж найбольш яго талент раскрыўся ў гэтым жанры. Адметныя ж задаткі былі ў першай уజо кнізе «Касавіца».

З гэтага зборніка і пачалося стварэнне Віктарам Гардзеем свайго паэтычнага свету, у якім заўсёды ёсць месца спаконвечным матывам дабра, справядлівасці, лучнасці з бацькоўскай зямлёй, любасці да блізкіх людзей. На паверхню выходзіць толькі сваё — самабытнае, ад чаго хораша і светла на душы. Пасля былі іншыя: «Верасное пасляслоўе», «Засевак Радзімы», «Межань»…

Апошні з іх цікавы не толькі новымі на той час творамі, але і напісанымі раней, якія па розных прычынах у папярэднія зборнікі не ўвайшлі. З'явіліся ў самым юным узросце, калі за плячыма — усяго нейкіх дваццаць гадоў. Па сутнасці, яшчэ хлапчуком быў. Але ў іх не толькі шмат шчырасці, што суседнічае і з паэтычнай наіўнасцю. Ёсць і іншае, больш важнае — тое, чаго часам не стае сённяшнім паэтам-дэбютантам — непасрэднасць, уменне ўспрымаць рэчаіснасць вобразна, так, што і на адлегласці часу нельга не радавацца таленту іх аўтара, які пачаў раскрывацца так рана.

Маё знаёмства з Віктарам адбылося ў 1983 годзе, калі ён прыйшоў працаваць у рэдакцыю часопіса «Беларусь», пераехаўшы з Ганцавіч. З'явіўся ў Мінску не звычайным раёншчыкам, з якога нямала ахвотных, у каго таленту калІва, пакпіць, а сапраўдным журналістам. Прайшоў школу легендарнага рэдактара Васіля Праскурава, які пазней быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР. Шмат дала па-сапраўднаму творчая атмасфера, што панавала ў газеце «Савецкае Палессе». Дзякуючы Васілю Фёдаравічу склаліся багатыя творчыя традыцыі. У розны час у рэдакцыі працавалі паэты Міхась Рудкоўскі, Іван Кірэйчык, у газеце друкавалі свае першыя творы Мікола Антаноўскі, Алесь Каско, Уладзімір Марук, Мікола Купрэеў...

Хораша станавілася на душы, калі знаёміўся з вершамі Віктара. Разам з тым сорамна было за калег-крытыкаў, якія, надта ж налаўчыўшыся складваць розныя «абоймы», чамусьці «забываліся» знайсці ў іх месца Віктару Гардзею. Яму, бадай, прыкра было за такую няўважлівасць. Ды ён стараўся не звяртаць на гэта ўвагі. Ды, можа, толькі выгляд рабіў. Аддушыну ж знаходзіў у напісанні новых твораў.

Як любяць яго землякі, упэўніўся ў канцы жніўня 1996 года, калі разам з ім завітаў у Малыя Круговічы. Мясцовыя ўлады і Ганцавіцкі раённы выканаўчы камітэт пастанавілі прысвоіць вуліцы ў Малых Круговічах, дзе прайшло яго маленства, імя выдатнага земляка. На вясковай паляне адбыліся такія ўрачыстасці, прысвечаныя яго 50-годдзю, пра якія многім паэтычным «мэтрам» застаецца толькі марыць.

Як не радавацца такой увазе! І ён радаваўся. Аднак у некаторых вершах прысутнічала самотнасць. Асабліва шмат з'явілася яе пазней, у кнізе «Межань». За ёю — уласна-перажытае, выпакутаванае. Вёска для яго па-ранейшаму заставалася скарбніцай найлепшых дзён. Як і ўся прырода роднае аселіцы: «За вёску іду, як у храм». Але не пакідала і адчуванне незваротнасці страчанага. «Каб не пабег я рана-раным // За вёску і яшчэ далей, // Дык не хадзіў бы знерваваным // І жыў бы, можа, весялей». Як жа інакш: «У лясах, што аж да небакраю, // Нехта тут блукае ўжо другі. // Стану я на выспе — пагукаю, // Сам сябе, вясёлага, з імгі». Прысутнічаў і асабісты боль:

*Чаму ж так? Гляджу вінавата.*
*Лёс выграў з пагляду майго*
*І сына-салдата, і брата,*
*І брата яшчэ аднаго.*

Ды паэт на тое і паэт, што ў стане ўзвысіцца над асабістым, каб разважаць і пра жыццё ўвогуле, і пра смерць як заканамернае завяршэнне зямнога існавання чалавека. Пры гэтым ён ішоў найперш ад асабістага, прамаўляючы вуснамі лірычнага героя:

*Вунь Харона чаўны. І — бязмоўе.*
*Кінуў лёс пакаленні на тлум.*
*У бяроз, як і ў нас, белакроўе,*
*І няма прасвятлення для дум.*

Але ён прыходзіць і да высновы, якая дазваляе зразумець, што жыццё бясконцае ў сваёй хадзе і кожны, хто жыве, павінен напоўніцу радавацца яму, ведаючы, што наперадзе чакае штосьці новае, яшчэ нязведанае і неспазнанае:

*Не спяшайце, чаўны, не адчальце:*
*Мноства з'яў таямніцай пакуль.*
*Вось і сёння па мокрым асфальце*
*Вожык бег, а куды і адкуль?*

Не зніклі з вершаў Віктара Гардзея смутак, адчай. Аднак усё ж куды больш было ў іх радасці, светласці, паэтычнай свежасці. Паэт знаходзіў у сабе сілы пераадолець песімізм, душэўную адзіноту, таму яго лірычны герой спяшаўся жыць, дзяліцца сваімі вялікімі і малымі радасцямі. Гэта асаблівая добра відаць па вершах, у якіх апяваецца прырода, што аднолькавая ў сваім харастве ў розныя поры года. Удыхаючы гэтае хараство на поўныя грудзі, пачынаеш упэўнівацца ў тым, што сам ты таксама жывая часцінка гэтага вялікага хараства: «Разумею: я патрэбен // Полю шэраму ў вясне. // Момант ісціны, што ў хлебе, // Па жыцці вядзе мяне». І далей:

*Не сагрэлася б пад снегам*
*Без майго дыхання рунь.*
*Нахапілася адлега.*
*Ручаі бягуць угрунь.*

Па-зямному хораша і ўсцішна станавілася ў храме яго паэзіі, у якім гэтак лёгка клаўся радок да радка. А там, дзе сапраўдны талент, няма неабходнасці кідацца ў марнае эксперыментатарства ці займацца рэбусавасцю. Проста пішы, як думаеш, і цябе зразумеюць:

*Весялей і лягчэй, і суцішней —*
*Штось жывое чуваць ля вакон.*
*То душа, прытварыўшыся вішняй,*
*Мой трывожны падсвечвае сон.*

*Думаў, знікла — не вернеш бяглянку,*
*І тады стане млосна зусім,*
*Але бачу, прачнуўшыся ўранку,*
*Як святлее ў пакоі маім.*

Разам з тым Віктар Гардзей валодаў і яшчэ адной якасцю, важнай для любога пісьменніка, але для паэта ў большай ступені — назіральнасцю. Праходзіць прамежак часу (у залежнасці ад значнасці назіранняў меншы ці большы), і нараджаецца чарговы твор.

Не абмяжоўваючыся паэзіяй, перайшоў да прозы. Адметнасць яе — моцныя аўтабіяграфічныя моманты. Калі ж глядзець шырэй, прысутнічае нязменнае жаданне расказваць пра землякоў. Аб гэтым засведчыла яшчэ аповесць «Дом з блакітнымі аканіцамі», што дала назву яго першай кнізе прозы. Затым быў зборнік «Карані вечнага дрэва», цэнтральнае месца ў ім заняла аповесць «Жыта ганьбу не заслоніць» з жыцця пасляваеннай заходнебеларускай вёскі. Гэтаксама прыхільна як чытачы, так і крытыка сустрэлі трылогію «Аселіца Чорнага мора» і раман «Бедна басота».

З поспехам пісаў для дзяцей, аб чым засведчылі зборнікі вершаў «Чырвоны грабеньчык», «На арэхавай палянцы», «Коцікі на вярбе», «Мой тата — трактарыст», «Зай, які лічыў варон», «Зайкава балалайка»... І нядаўняя кніжка — «Як мядзведзікі тату згубілі», што выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». А яшчэ ён аўтар унікальнай дылогіі «Малая дзіцячая Чырвоная кніга», у якой расказваецца пра рэдкія віды беларускай фауны і флоры. Спачатку даюцца звесткі, а пасля ідуць вершаваныя радкі. У гэтай незвычайнай дылогіі, як і шмат у якіх вершах і казках для дзяцей, Віктар Гардзей паказаў сябе чалавекам з добрым пачуццём гумару. Досціп, тонкая ўсмешка спрыяюць таму, што дзеці ахвотна завучваюць творы на памяць.

Плённа ж працуючы ў галіне перакладу — як паэтычнага, так і празаічнага, ён паказаў сябе і выдатным знаўцам беларускай мовы. Гэта відаць, прынамсі, з двухтомніка казак народаў Еўропы «Хрустальны калодзеж», які вытрымаў два выданні.

Выраз «Ёсць патрэба бачыць родны дом» у дачыненні да Віктара Гардзея набывае сёння больш значны і больш шырокі сэнс. У жыцці і творчасці пісьменніка прысутнічала патрэба пастаянна бачыць родную Беларусь — як той дом, у якім жыць усім нам разам. І які будаваць супольна. У меру таленту кожнага. Што і рабіў упэўнена паэт, празаік, дзіцячы пісьменнік, перакладчык.

Некалі пішучы пра творчасць Віктара Гардзея, свайму артыкулу я даў загаловак «Зямное і вечнае». Цяпер напрошваецца іншая назва: «З зямнога ў вечнае». Зямны яго шлях завяршыўся. Віктара Гардзея ўжо няма. Няма і ніколі не будзе. Застаецца ён толькі ў нашай памяці. Наперадзе — іншы шлях, нам не вядомы. Спяшацца ў яго не хочацца. Аднак, калі такая часіна настане, хацелася б увайсці ў яго прасцягі так сумленна, як жыў і тварыў ён.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

**Рагнед МАЛАХОЎСКІ**

## Паміж сяўбою і жнівом

У вянок памяці Віктара Гардзея

*Паміж сяўбою і жнівом бяжыць час незаўважна,*
*непрадказальна, але няўмольна.*
*З надзеяй на багаты ўраджай паэт-сейбіт сее насенне.*
*Душа напоўнена ўсясветнай любоўю да зямлі*
*і нязломнай верай у найлепшае ў людзях.*
*Таму ён упэўнены і ведае, што ўзыдзе пад сонцам.*

*У жыцці, як і ў бяскрайнім полі,*
*кожны парастак змагаецца за святло,*
*за кроплю дажджу, за будучыню свайго роду.*
*Паэт-сейбіт згінае спіну і слухае маўчанне зямлі,*
*каб раскрыць схаваную ў ёй мудрасць,*
*зведаць адвечныя таямніцы.*

*Калісьці настане жніво — момант ісціны.*
*Збожжа і пустазелле аддзеляцца навекі.*
*Што застанецца пасля — багаты набытак*
*або пустэча, дзе вецер ганяе пыл?*

*Паміж сяўбою і жнівом прыходзіць разуменне,*
*што сэнс — у самой працы, у кожным удыху,*
*у кожнай кроплі поту, у кожнай выказанай думцы.*
*Але аднойчы паэт-сейбіт складзе свой рыштунак,*
*акіне вокам пройдзены шлях і сыдзе ў цішыню,*
*пакінуўшы зямлі сваё апошняе зярнятка.*
*А смутак заўтрашняга жыта*
*ўскалыхне душы нашчадкам-паслядоўнікам.*

# Пра землякоў з павагай і гонарам

**Што з'явіўся гэты матэрыял, «вінаватыя» навагоднія святы. Столькі выхадных дзён было сёлета, як ніколі. Узяўся перабіраць кнігі з аўтографамі. Так і натрапіў на «Белорусы и Русский Север» Валерыя Ярмоленкі. Валерый Аляксандравіч падпісаў яе мне ў тым жа 2009 годзе, калі яна выйшла. Надпіс, можна сказаць, традыцыйны: «Уважаемому Александру Андреевичу Марциновичу (так у арыгінале) с пожеланием творческих успехов». Дарыў яму і я свае кнігі. А ці рэцэнзаваў яго, штосьці не памятаю. Пра ўсе не напішаш, а ён быў з тых, хто на гэтым не настойваў. Таму і атрымалася так, што пра яго як творцу ведаюць куды менш, чым варта было б.**

Быў ён не толькі выдатным пісьменнікам, які плённа працаваў на ніве краязнаўства, але і вучоным ў галіне навукі аб Зямлі, доктарам геаграфічных навук. Нарадзіўся не на беларускай зямлі, а ў сяле Семазёрным Кустанайскай вобласці ў Казахстане 31 кастрычніка 1940 года, але менавіта на Беларусі раскрыў свой талент.

Біяграфія яго таксама цікавая. Скончыўшы сярэднюю школу ў Вілейцы, вучыўся ў Ленінградскім горным інстытуце, дзе атрымаў дыплом горнага інжынера-маркшэйдара. Пасля скончыў завочнае аддзяленне па спецыяльнасці «Эканоміка і арганізацыя горнай прамысловасці» гэтай вышэйшай навучальнай установы. Прафесіі, зразумела, з літаратурай не звязаны. Як і кандыдацкая, а потым доктарская дысертацыі.

У навуковых працах даў эканамічную ацэнку ўсіх відаў карысных выкапняў Беларусі: калійных солей, фасфарытаў, каменнага вугалю і сланцаў, металаў.




Распрацаваў праграму рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя для вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» і «Экалагічную Праграму горна-хімічных вытворчасцей для прадпрыемстваў СССР да 2010 года». Усяго напісаў больш чым 400 навуковых прац, сярод якіх 5 манаграфій. Каля 30 артыкулаў апублікаваны за мяжой.

Каб назваць артыкулы, нямала месца спатрэбіцца, а кніг не так і шмат. Затое якія! Прачытаць іх — адно задавальненне. Напрыклад, «За даляглядамі Айкумены», якая ў 1995 годзе з'явілася ў серыі «Нашы славутыя землякі» тагачаснага выдавецтва «Навука і тэхніка» (цяперашняе «Беларуская навука»). Гэта сёння пра падарожніка, даследчыка, палеантолага, географа, энтамолага, геолага Івана Чэрскага ведаюць многія, а Валерый Ярмоленка адным з першых падрабязна расказаў пра яго.

Цікаўнасць у чытачоў дапытлівых, ахвотных больш ведаць пра ўраджэнцаў Беларусі, якія праславілі яе сваёй працай, даказалі, чаго варты наш народ, — даследаванне Валерыя Аляксандравіча «Горныя інжынеры Беларусі — выхаванцы Санкт-Пецярбургскага Горнага інстытута» (1998). Ён стаў і адным з аўтараў альбома-атласа «Географы і падарожнікі Беларусі» (1999), арыгінальнай сваёй кампазіцыйнай пабудовай. На кожнай старонцы — партрэт і кароткая біяграфія вядомага падарожніка. Прыводзіцца і картасхема тых мясцін, дзе ён пабываў, а таксама змешчаны пейзажныя замалёўкі.

Артыкулы, кнігі Валерыя Ярмоленкі напісаны не толькі з прыцягненнем багатага фактычнага матэрыялу. Па неабходнасці ў іх выкарыстоўваюцца першакрыніцы, ёсць спасылкі на аўтарытэтных даследчыкаў. Важна і тое, што яго развагі, аргументы напоўнены пачуццём нацыянальнай годнасці. Тым, што ўраджэнцы Беларусі працавалі і на карысць іншых народаў, ён ганарыўся. Аднак хацеў, каб ведалі, адкуль яны родам.

Гэтая думка гучыць і ў прадмове да кнігі «Белорусы и Русский Север»: «Результаты деятельности многих белорусов стали достоянием не только российской, но и мировой науки и культуры, мировой цивилизации. Казалось бы, белорусскому народу есть чем гордиться. Однако это далеко не так. Буквально все достижения белорусов до сих пор считаются достоянием… Польши». Прычыну бачыў і ў тым, што «огромную ошибку допустили Брокгауз и Ефрон, которые в "Энциклопедическом словаре" (1890—1907) всех знаменитых белорусов назвали поляками. Их "материалы" автоматически перешли в советские энциклопедии».

Кніга «Белорусы и Русский Север» — гэта пошук ісціны ў згаданым кірунку. Асабліва гэтага тычыцца першага раздзела «Легендарное прошлое». Працай яе аўтару аргументаваць свае высновы, калі таму ёсць дакументальнае пацвярджэнне. Прынамсі, у «Пинежской летописи» сказана, што першым сярод тых, хто асмелiўся ісці па Ледавітым акіяне на ўсход, быў Юрый Даўгушын: «Лета 7105 (1597 год по новому стилю) первым проведал Надымреку, а на другой год Таз-реку». Пра яго і апавядаецца ў главе «"Златокипящая вотчина" белорусов». Пра ўраджэнцаў Беларусі размова ідзе і ў іншых матэрыялах: «Достославные братья Лаптевы», «Кто открыл Аляску», «Таинственный узник»… Паступова аповед набліжаецца да нашых дзён: «Вместе с россиянами из XIX века в век XXI». Адзін з апошніх матэрыялаў — «Субмарины подо льдом Арктики», у якім гаворка пра тое, як савецкія падводныя лодкі прайшлі пад Паўночным Ледавітым акіянам. Дачыненне да гэтага паходу мелі і беларусы.

Валерый Аляксандравіч незадоўга да сваёй смерці (яго не стала 22 верасня 2015 года) аддаў рукапіс яшчэ адной са сваіх кніг у выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя». Пра гэта сказаў мне, калі я падпісаў яму свой трохтомнік «Хто мы, адкуль мы…», што выйшаў у 2008 годзе ў выдавецтве «Беларусь». Абяцаў падарыць. Цікава, які лёс яго кнігі. Дарэчы, і яго «Белорусы и Русский Север» таксама з'явіліся ў «Беларусі». Серыя называлася «Землякі».

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Вітражы душэўнай шчодрасці

**Кнігі, выдадзеныя ў правінцыі, заўжды валодаюць асаблівай аўрай прыцягальнасці. Гартаючы іх старонкі, адчуваеш суладнасць з тым мастацкім светам, які сілкуе аўтараў і чытачоў у розных старонках бязмежнай нашай Айчыны. І асабліва радуешся, калі творы, змешчаныя, як правіла, пад сціплымі вокладкамі, заслугоўваюць увагі самага шырокага чытача. Галіна Загурская, якую ўжо добра ведаюць у Полацку, на ўсёй Віцебшчыне, нарадзілася ў Лявонпалі Мёрскага раёна, у мясціне, якую маляўніча апісаў вядомы беларускі паэт Сяргей Панізнік. Першая кніга паэтэсы, якая да вершаў прыйшла ў сталым узросце, — «З далоняў сэрца» — выдадзена ў 2007 годзе. Пасля былі зборнікі «Да зямлі прытуліцца», «З росаў святаянных», «У месяцовым перламутры», «Бераг зарападаў», «Санеты».**

Новая кніга — «Жывуць у Полацку стагоддзі» — пабачыла свет у мінулым, 2024-м, годзе. «Сяўба вякоў узыходзіць рунню — // Вяртае памяць пра былое. // І нам гаворыць пра святое // Абуджанага часу руны. // Яны — у вітражах касцёлаў // І ў фрэсках праваслаўных храмаў, // Ва ўсіх людскіх пакутных драмах, // Што помняць гарады і сёлы». Паэтэса сабрала ў адной кнізе творы, прысвечаныя роднаму Полацку, якому аддадзена большая частка жыцця, палачанам, якія пакінулі след у айчыннай гісторыі і культуры, а таксама асобам, якія і сёння цесна звязаны з багатым на памяць вякоў горадам. З першых старонак было нейкае адчуванне неспакою. Усё ж вытрымаць няхай сабе і важкі, але ў прасторы абмежаваны, пэўны тэматычны абсяг на добрым творчым узроўні даволі складана. Але, старонка за старонкай, чытаючы кнігу, гэтай трывогі, гэтага неспакою ўдалося пазбавіцца. Паэтэса, апантана ўлюбёная ў творчую, культурную спадчыну папярэднікаў добра ведае гісторыю, і па-майстэрску выбудоўвае сюжэты, кампазіцыю. Знаходзіць пераканаўчыя радкі, што пашыраюць нашу ўлюбёнасць у Полацк, Полаччыну і нараджаюць захапленне, радасць ад сустрэчы з яе вершамі.

Пераканаўчай падаецца шчырасць аўтара кнігі «Жывуць у Полацку стагоддзі…» пасля прачытання верша «Спатканне з гісторыяй» (з прысвячэннем: «Нялюбай раней гісторыі…»):

*Гісторыя, цябе я не любіла,*
*Бо часта ты няшчырыю была:*
*Хоць з гонарам сваё імя насіла.*
*Ды ісціну зусім не берагла.*

*А праўда ж прабіваецца праз церні,*
*Бо немагчыма ўсё ж яе схаваць.*
*З вякоў ранейшых адыходзяць цені,*
*Калі старанна ісціну шукаць.*

Вось у гэтым клопаце, звязаным з пошукам ісціны, у жаданні вызваліць прыхаваную на архіўных паліцах гісторыю, на мой погляд, і хаваецца грамадзянская сіла паэтычнага радка Галіны Загурскай. Запал, творчае гарэнне выводзяць вершы, часам вельмі моцна прывязаныя да пэўных падзей ці гістарычных персанажаў, за межы ілюстрацыйнасці, мастацкага пераказу вядомых фактаў. У значнай ступені удачай можна лічыць і паэму «Усяслаў Чарадзей», якая ўпрыгожвае, умацоўвае кнігу паэзіі пра Полацк. Полацкі князь Усяслаў Брачыслававіч, якога «ахрысцілі» Усяславам Чарадзеем і Усяславам Полацкім, — асоба літаратурная, мастацкая, персанаж, якому прысвечана мноства твораў. З апошніх па часе — «Усяслаў Чарадзей» слыннага нашага паэта Алеся Бадака. Ён паклаў у аснову




важны фрагмент з жыццяпісу Усяслава Чарадзея, той эпізод, калі яго трымалі ў палоне… Галіна Загурская стварыла ўвогуле мастацкую біяграфію полацкага князя, паказала працэс станаўлення асобы, вытокі фарміравання характару разумнага гаспадара княства, клапатлівага ўладара падначаленага яму народа… «Уладу князя прызнавалі Браслаў, // Заслаўе, Менск. І Віцебск княжым быў… // І можна падзівіцца з тых абрысаў // Дзяржавы моцнай, што Ўсяслаў стварыў…» Паэтэса імкнецца не парушыць нашы ўяўленні пра ўсё, што гістарычна атачае яркую постаць. Задачу перад сабою Галіна Загурская паставіла складаную. І, як на мой суб'ектыўны погляд, годна яе выканала.

*Праліў нямала князь крыві варожай,*
*Але любіў больш мірнае жыццё,*
*Таму і правіў у краіне гожа*
*І не сышоў дасюль у забыццё.*

Паэтэса, рэалізоўваючы памкненне да выкладання паўнавартаснага мастацкага жыццяпісу полацкага князя, ідзе ў рэчышчы, якое ўжо пракладзена ў беларускай паэзіі (варта згадаць гістарычныя паэмы Максіма Танка, Міколы Арочкі, іншых майстроў прыгожага пісьменства). І пры гэтым Галіна Загурская імкнецца быць арыгінальнай, яна выразна акрэслівае свой погляд на галоўнага героя, яго ролю і месца ў гісторыі нашай Айчыны. Паэма «Усяслаў Чарадзей» напісана ў новы час, у XXI стагоддзі.

У кнізе паэзіі «Жывуць у Полацку стагоддзі…» — яшчэ і паэма «Князь Валодша». Персанаж — з полацкай галінкі Рурыкавічаў, сын Давыда Усяславіча. Упершыню згаданы ў Іпацьеўскім летапісе пад 1159 годам. Калі менскія князі Глебавічы напалі на Ізяслаўль, Валодша трапіў у палон, быў закаваны ў жалеза. У 1160 годзе полацкі князь Рагвалод-Васіль вызваліў Валодшу з палону. Гістарычных звестак пра гэтую асобу зусім няшмат, яны даволі супярэчлівыя. Зварот паэтэсы да вобраза Валодшы можна лічыць адважным мастацкім крокам. Але ж як у паэзіі без адвагі і смеласці?!.

Цікавасць чытача, несумненна, выклічуць і вершы, балады, якія Галіна Загурская прысвяціла Івану Хруцкаму, Алесю Дудару, Янку Купалу, Канстанцыі Буйло, Петрусю Броўку, Алесю Савіцкаму, Генадзю Бураўкіну, Пятру Васючэнку, Івану Стадольніку і іншым дзеячам культуры, пісьменнікам. Зборнік дапаўняе і даволі цікавы нарыс «Маё "Надзвіння"» — пра блізкія да нас гады ў дзейнасці багатага на гісторыю полацкага літаратурнага аб'яднання. Ілюстрацыямі да зборніка паслужылі малюнкі самой Галіны Загурскай, якія істотна ўзбагачаюць змест.

**Раман СЭРВАЧ**

# Новыя вымярэнні творчасці

**У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адкрылася выстаўка «У кожнага свой Купала!», прымеркаваная да 100-годдзя прысваення Янку Купалу звання «Народны паэт Беларусі». У экспазіцыі — творы беларускіх мастакоў, якія знаёмяць з новымі гранямі творчасці і асабістага жыцця сусветна вядомага пісьменніка.**

Выстаўка адкрывае шэраг юбілейных мерапрыемстваў, якімі будзе насычаны 2025 год. Наведвальнікаў чакаюць літаратурныя вечары, тэатральныя пастаноўкі па творах Янкі Купалы, музычныя імпрэзы, конкурсы, выставачныя праекты і шмат іншага.

Янка Купала ўжо даўно стаў сімвалам роднага краю, а яго творчасць — візіткай беларускай літаратуры. Ужо ў 20-я гады мінулага стагоддзя пісьменнік быў знакаміты. У гэты ж час яго талент атрымаў і афіцыйнае прызнанне з боку дзяржавы. Пастановай ад 10 чэрвеня 1925 года Савет народных камісараў БССР абвясціў аб прысваенні Янку Купалу звання народнага паэта. Ён стаў першым народным паэтам Беларусі.



Сяргей Гумілеўскі.



Сяргей Асапрылка «Партрэт Янкі Купалы», 1983 г.

— Сёлета мы адзначаем 100 гадоў з дня прысваення Янку Купалу ганаровага звання «Народны паэт БССР». Гэта была значная падзея не толькі ў жыцці Песняра, але і ў гісторыі ўсёй беларускай літаратуры. Выставачны праект «У кожнага свой Купала!» — гэта яшчэ адна магчымасць сустрэцца з паэтам, з такім, якім яго бачылі мастакі, такім, якім ён застаўся на фотаздымках, — выступіла з прывітальным словам дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна Галінская.

У зборах музея мастацкая Купаліяна налічвае больш за 1500 адзінак захоўвання. Для часовай экспазіцыі выбрана 11 жывапісных твораў і 6 скульптурных работ, створаных рознымі аўтарамі і ў розны час. Вобразы паэта, увасобленыя мастакамі, можна параўнаць з прадстаўленымі на выстаўцы фотаздымкамі Янкі Купалы за 1904 і 1912, 1939 і 1941 гады. Скульптурныя работы, прыжыццёвыя партрэты народнага паэта і сюжэтныя кампазіцыі беларускіх майстроў па-новаму раскрываюць шматгранную асобу вялікага творцы. Тут можна ўбачыць і маладога Купалу, які толькі ступіў на літаратурны шлях (Леў Раберман «Малады Янка Купала» (1956), Аляксандр Ксяндзоў «Янка Купала ў Вільні. Перад прэм'ерай "Паўлінкі"» (2008)), і Купалу ў самым росквіце яго паэтычнага таленту (Сяргей Асапрылка «Партрэт Янкі Купалы» (1983), Станіслаў Рабашчук «Янка Купала на зямлі Т. Шаўчэнкі» (1982), Аляксей Глебаў «Янка Купала» (1962)), і ў сумны час, напоўнены горам і выпрабаваннямі, — падчас эвакуацыі (Міхалай Гусеў «Янка Купала на беразе Волгі» (1949), Валянцін Волкаў «Партрэт Янкі Купалы» (1958)).



Міхась Пазнякоў.

Прыцягвае ўвагу адзіны ў выставачнай прасторы гарадскі пейзаж Льва Лейтмана «Купалаўская таполя» (1957). Высокая чорная таполя да Вялікай Айчыннай вайны расла недалёка ад сядзібы паэта. Дрэва неаднойчы фігуруе ў творах пісьменніка.

Упершыню ў адной прасторы размешчаны творы сябра паэта — мастака Дзмітрыя Полазава. Прадстаўленыя партрэты Янкі Купалы былі напісаны ў 1921 годзе ў Мінску на вуліцы Садова-Узбярэжнай — цяпер гэта парк імя Янкі Купалы. Карціны Дзмітрый Полазаў збярог у блакадным Ленінградзе, а ў 1947 годзе перадаў у музей. Праект помніка Янку Купалу 1950-х гадоў (Леў і Марк Раберманы) наведвальнікі таксама ўбачаць упершыню.

Да вобраза класіка неаднойчы звяртаўся і народны мастак Беларусі Міхаіл Савіцкі. На выстаўцы дэманструецца яго работа «Янка Купала. 1942» (1988).

На адкрыцці выставачнага праекта завіталі кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі паэт і празаік Міхаіл Пазнякоў, скульптар, лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы Сяргей Гумілеўскі.

— Для ўсіх пакаленняў літаратараў Янка Купала — узор служэння роднай зямлі і свайму народу, — выступіў на адкрыцці экспазіцыі Міхаіл Пазнякоў. — Мой Купала — гэта мой настаўнік, у якога можа вучыцца кожны, не толькі пісьменнік. Вучыцца быць са сваім народам, разумець і паважаць сваю культуру. Мой Янка Купала — гэта і сёння настаўнік творчай моладзі. Таму што яго творчасць з'яўляецца нашай асновай, а нічога новага не можа ўзнікнуць без глебы.



Арлен Кашкурэвіч «Янка Купала ў Пецярбургу», 1981 г.

— Да творчасці Янкі Купалы я прыйшоў дзякуючы бацьку. Ён пранёс захапленне народным паэтам праз усё жыццё і ў сваіх работах перадаў наступным пакаленням. Цікава ўспомніць, як пачыналася работа над помнікам у Мінску (парк імя Янкі Купалы), які быў усталяваны ў 1972 годзе. Майго бацьку і Анатоля Анікейчыка запрасіў да сябе Аляксей Глебаў для распрацоўкі праекта будучага помніка. У 1968 годзе Глебаў памёр, таму далей працаваць над праектам давялося майму бацьку і Анатолю Анікейчыку. На мой погляд, гэта найлепшы помнік Купалу. Нават сёння ён выглядае сучасна і адлюстроўвае народную сутнасць паэта. Першапачатковы праект помніка на Кутузаўскім праспекце адрозніваецца ад таго, што мы бачым сёння. Гэта была доўгая і складаная праца, некаторыя моманты трэба было ўзгадняць з рознымі арганізацыямі не толькі ў Маскве, але і ў Мінску. Аднак у помніку мы змаглі адлюстроўваць галоўную ідэю праекта — натхнёнага паэта, сэрцам прывязанага да Беларусі, — падзяліўся на адкрыцці выстаўкі Сяргей Гумілеўскі.





Калі чалавек асвойвае базу той ці іншай галіны, тады можна сказаць, што ён развіваецца і расце і ўжо здольны адкрыць нешта новае. Параўноўваючы нашу і сусветную літаратуру, скажу: нам пашанцавала мець такія магутныя постаці, як Янка Купала, Якуб Колас і Максім Багдановіч.

Сёння імя народнага паэта Беларусі вядома на ўвесь свет, яго творы друкуюцца на розных мовах, а геаграфія яго прыхільнікаў ужо даўно выйшла за межы нашай краіны. У 2006 годзе на Кутузаўскім праспекце ў Маскве ў памяць аб знаходжанні там беларускага паэта быў усталяваны помнік Янку Купалу па праекце Льва і Сяргея Гумілеўскіх.

Творы з калекцыі аздабляюць старонкі шматлікіх друкаваных выданняў, у тым ліку і падрыхтаваны музеем альбом-каталог «Я адплацяў народу, чым моц мая магла» (2019).

Атмасферу цеплыні і творчага яднання на адкрыцці выстаўкі стварылі студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**

# Чалавек, які натхняе

**У нашай краіне адбылася доўгачаканая прэм'ера дакументальнага фільма пра Аляксея Талая. Доўгачаканая, бо менавіта такога героя не хапала на вялікім экране, ён — унікальны прыклад для кожнага, але ў першую чаргу для маладога пакалення. З-за няшчасця ў 16-гадовым узросце Аляксей мог паглыбіцца ў сябе, стаць закрытым. І ўсё ж ён вытрымаў і стаў вядомым чалавекам, які сапраўды натхняе жыць, працаваць, любіць і дапамагаць іншым. Яго гісторыя падштурхнула і Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм» на стварэнне менавіта такога дакументальнага фільма. Над стужкай «Птушка Фенікс Аляксея Талая» працавала студыя «Летапіс», а дакладней рэжысёр-дакументаліст Уладзімір Луцкі. Сцэнарый напісаў Яўген Агурцоў. Але гэта той выпадак, калі ідэю падказала само жыццё.**

**Фільм было цікава паглядзець не толькі для таго, каб больш даведацца пра Аляксея Талая, але і раскрыць яго сакрэт: што ж дапамагло «ўзляцець» над абставінамі лёсу і стаць вядомым чалавекам, нарадзіўшыся зноў, як чароўная птушка Фенікс? Дык хто ці што яго акрыліла ў самы цяжкі момант жыцця? Пра гэта і распавядае дакументальная стужка.**

## Ад вялікай трагедыі — на вялікі экран

Упершыню рэжысёр Уладзімір Луцкі сустрэўся з Аляксеем Талаем у пачатку вясны 2024 года. Тады яшчэ быў жывы аўтар сцэнарыя, які, на жаль, ужо пайшоў у іншы свет… Але роля Яўгена Агурцова ў падачы гісторыі пра Аляксея Талая таксама адметная, таму варта згадаць яго імя.

— Пасля сустрэчы з героем нашага фільма мы з аўтарам сцэнарыя выйшлі вельмі натхнёныя, бо Аляксей перад намі раскрыўся крыху інакш, чым мы яго ўяўлялі, — успамінае Уладзімір Луцкі. — Да знаёмства думалася, што Аляксей не настолькі адкрыты чалавек. Насамрэч я вельмі ўдзячны нашаму герою, што ён так дапамагаў распавесці гісторыю пра сябе, быў сапраўды шчырым, даверыўся здымачнай групе. Не кожны можа настолькі паглыбіць у сваё жыццё, асабліва ў цяжкія моманты, чужых людзей. Але пры дапамозе выключна рэжысёрскіх прыёмаў фільма не атрымалася б. Для мяне было прынцыпова важна распавесці пра трагедыю, якая адбылася з Аляксеем. І ён змог пра ўсё паведаміць нам, хоць гэта няпроста. Але менавіта пасля той жахлівай сітуацыі і адбыўся ўзлет Аляксея Талая, таму і з'явілася параўнанне яго з птушкай Фенікс.

Здымкі пачаліся ў верасні 2024 года. Рэжысёр доўга шукаў рашэнне, як падаць гісторыю пра Аляксея Талая, які тон і настрой выбраць. Неяк натрапіў на выраз: «У Бога быў план, каб гісторыя майго жыцця стала надзеяй для іншых». Пасля гэтага стала зразумела, як выбудаваць работу.

— Аляксей Талай — сапраўдны герой нашага часу. Я задаволены рэакцыяй гледачоў. Было відаць, што людзі заразіліся пэўным настроем, а значыць, нам удалося зрабіць фільм, які сапраўды матывуе, дорыць надзею на лепшае, — падзяліўся ўражаннямі рэжысёр пасля першага паказу стужкі. — Хтосьці з гледачоў нават выказаў думку, што лёс Аляксея Талая можна параўнаць з гісторыяй лётчыка Аляксея Марэсьева (ён стаў прататыпам героя кнігі Барыса Палявога «Аповесць аб сапраўдным чалавеку». — **Аўт.**). Ён таксама быў у цяжкай сітуацыі, і яго воля жыць, яго вялікае імкненне да найлепшага ўсё змянілі. Вельмі хочацца, каб у нашага фільма была добрая гісторыя, каб больш людзей яго паглядзелі, бо ён таго варты.

## Прэм'ера ў дзень нараджэння

Дык ці варта глядзець кіно? Вядома! Аўтар гэтых радкоў, шчыра кажучы, думала, што выйдзе з кіназалы са слязамі на вачах (і ў стужцы ёсць кранальныя моманты, якія могуць прымусіць расплакацца чулліўых людзей, бо гэта сапраўды шчырая гісторыя!). Але атрымалася настолькі матывацыйнае кіно, паглядзець якое хочацца параіць усім, хто скардзіцца на жыццё. Фільм сапраўды пранізлівы. І хронаметраж не такі вялікі, таму кожны ахвотны зможа знайсці час.

Дарэчы, на прэм'еры ў кінатэатры «Беларусь» (яна адбылася 22 студзеня — непасрэдна ў дзень нараджэння галоўнага героя) быў і сам Аляксей Талай, які падзяліўся з карэспандэнтам «ЛіМа» ўражаннямі ад прагляду фільма пра сябе:

— Я ўдзячны кіраўніцтву Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» і Міністэрству культуры за тое, што было створана такое кіно. Гэта сапраўды важна не толькі для мяне, маёй сям'і, але і для мноства людзей. Спадзяюся, мой прыклад натхніць іншых не здавацца ў цяжкія моманты.

Самае галоўнае — мы захавалі сябе і змаглі з'яднацца ў гэты няпросты час. Канешне, яшчэ шырэй можна было б пазнаёміць з дабрачыннымі праектамі нашага фонду, якія ўжо рэалізаваны. Аднак я разумею, што ёсць пэўны фармат, зручны для гледача. У цэлым мне фільм вельмі спадабаўся! Ён атрымаўся такім, як я і хацеў, гэтая работа зараджае надзеяй і верай.

## Музыка як сродак уздзеяння

У фільме важную ролю іграе музыка. Яна вельмі розная: баявая і далікатная, лірычная і драйвовая, таму пасля прагляду стужкі мы пагутарылі з кампазітарам.




Магчыма, хтосьці з нашых чытачоў мала ведае пра Аляксея Талая, таму нагадаем. З-за няшчаснага выпадку ў Аршанскім раёне хлопец застаўся без рук і ног, падарваўшыся на міне часоў Вялікай Айчыннай вайны (пра гэта падрабязна расказваецца ў кнізе Валерыі Сцяцко «Стваральнік свайго лёсу» і, вядома, у фільме «Птушка Фенікс Аляксея Талая»). Адбылося гэта напярэдадні Дня Перамогі, калі юнак прыехаў у госці да дзеда-ветэрана. Хлопец цудам выжыў. Цяпер ён заснавальнік дабрачыннага фонду, які носіць яго імя, бізнесмен і спікер-матыватар, паралімпіец, муж і бацька чацвярых дзяцей. Насуперак усім перашкодам.

Аляксей Талай прызнаўся, наколькі яму прыемна, што было прынята рашэнне аб прэм'еры фільма ў яго дзень нараджэння.

— Вядома, у 26 хвілін не ўпішуцца ўсе моманты з майго жыцця, у фільм увайшлі самыя галоўныя эпізоды. Калі было б больш часу, пэўна, ролю маці ў маім жыцці паказалі б яшчэ больш поўна, асабліва яе перажыванні за мой лёс, — перакананы Аляксей Талай. — Можна было б больш сказаць аб маёй жонцы і дзецях, бо ў фільме пра гэта ёсць, але не вельмі многа. Таксама можна было б распавесці больш пра маю першую жонку, якая была побач са мной у той цяжкі час… Мы праз многае прайшлі разам і дзякуючы гэтаму змаглі пераадолець многія выпрабаванні. Як і наша краіна, мая сям'я развівалася і прайшла самыя розныя этапы станаўлення, пераадолела шмат цяжкасцей…

— Музыка — паўнавартасны ўдзельнік гэтага фільма. У ім многа сцэн, дзе яна акцэнтуе ўвагу на тым ці іншым моманце, дапамагае паглыбіцца ў пэўны настрой ці падказвае канкрэтны ракурс, з якога лепш зірнуць на Аляксея Талая ў гэтую хвіліну, — тлумачыць Уладзімір Сівіцкі. — У сцэнарыі была прапісана музыка Цоя, бо яна выдатна падкрэслівае нерв нашага галоўнага героя. Але мне давялося шмат падумаць, як яе перапрацаваць, каб не было юрыдычных прыдзірак накont аўтарскіх правоў. Я зрабіў інструментальную версію, і ў самім фільме нават не песня, а мікс.

Сярод усіх саўндтрэкаў вылучаюцца музычная тэма маці, лірычная музыка, калі распавядаецца пра знаёмства з будучай жонкай (гэта наогул вельмі кранальная гісторыя кахання, якая дае надзею ўсім, хто лічыць, што ўжо нічога ў жыцці не будзе прыемнага), і кампазіцыя, якая дазваляе стварыць патрэбны настрой, калі расказваецца пра выбух, пасля якога жыццё Аляксея падзялілася на «да» і «пасля».

***Здымкі пачаліся ў верасні 2024 года. Рэжысёр доўга шукаў рашэнне, як падаць гісторыю пра Аляксея Талая, які тон і настрой выбраць. Неяк натрапіў на выраз: «У Бога быў план, каб гісторыя майго жыцця стала надзеяй для іншых». Пасля гэтага стала зразумела, як выбудаваць работу.***

— Асабіста для мяне наш фільм — гісторыя пра сілу волі, але я імкнуўся напісаць не пампезную мелодыю, — прызнаецца Уладзімір Сівіцкі. — Спадзяюся, дзякуючы музыцы ўдалося паказаць, наколькі Аляксей Талай любіць сваю сям'ю, спорт, само жыццё. Хачу адзначыць талент рэжысёра карціны, бо Уладзімір умее асэнсаваць гісторыю чалавека, падае яе вельмі тонка, глыбока і інтэлігентна. Пры гэтым не сыходзіць у крайнасць. І адпаведна мы ўсе цягнуліся да яго адчування гэтай гісторыі. Я рады, што працаваў з такім прафесіяналам!

Будзем спадзявацца, што гэта работа прынясе карысць не аднаму чалавеку, бо яна сапраўды ў духу нашага часу, калі вельмі патрэбны добры прыклад, які паказвае правільныя жыццёвыя каштоўнасці.

Ствараць фільм пра такога чалавека, як Аляксей Талай, — наогул нялёгкая справа, бо гэта і пачэсна, і вельмі адказна: героя ведаюць шмат людзей, якім дапамагае Фонд Аляксея Талая, яго сям'я, сябры, аднадумцы, паралімпійцы і г. д. Кожны з іх можа палічыць, што чагосьці не хапіла, каб стварыць цэласны партрэт героя… Аднак, відавочна, галоўнае тое, што такое кіно ў нас цяпер ёсць і яно будзе запатрабавана: яго варта паказваць школьнікам як мінімум з падлеткавага ўзросту, студэнтам, усім, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі і адчувае сябе «на ростанях», не верыць у сябе…

Паглядзеўшы стужку, можна з упэўненасцю сказаць: самыя галоўныя каштоўнасці ў жыцці — само жыццё, чалавек і чалавечнасць. Гэта асноўны лейтматыў фільма. Аляксей Талай выжыў, жыве і адчувае сябе шчаслівым, любімым, патрэбным дзякуючы людзям, якія апынуліся побач у цяжкую хвіліну. А цяпер ён сам дапамагае іншым, здзіўляючы сваёй энергіяй, моцным духам, самаіроніяй і ўсмешкай нават тады, калі згадвае самыя няпростыя перыяды жыцця. Ён не хавае, што былі і слёзы, і вялікае гора, што стаць такім, які ёсць сёння, было вельмі няпроста. І адзін бы ён сапраўды не вытрымаў. Але яму было дзеля чаго і дзеля каго жыць. Ці не такі ён, сапраўдны герой?

**Ірына ПРЫМАК**
**Фота БелТА**

Літаратура і мастацтва № 4 31 студзеня 2025 ЛіМ

# На мове музыкі

**Доктар мастацтвазнаўства, выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Інеса Двужыльная вядома ў нашай краіне і за яе межамі фундаментальнымі даследаваннямі тэмы Халакосту ў акадэмічнай музыцы краін былога Савецкага Саюза. Даследаванні надзвычай цікавыя. За імі стаяць два дзесяцігоддзі напружанай працы. Грунтоўна вывучаліся архіўныя матэрыялы і апублікаваныя крыніцы на рускай, англійскай, нямецкай, польскай, украінскай мовах. Былі глыбока прааналізаваны рукапісы музычных твораў, а таксама праведзена гіганцкая работа па апрацоўцы аўдыя- і відэаавізуальных запісаў, інтэрв'ю, гутарак і перапіскі з кампазітарамі і іх сваякамі, выканаўцамі, музыказнаўцамі, этнамузыколагамі, якія займаюцца рознымі пытаннямі ашкеназскай музычнай культуры. Шмат інфармацыі Інеса Двужыльная чэрпала падчас замежных стажыровак у адукацыйных цэнтрах Халакосту, музеях розных краін (Расіі, Ізраіля, Украіны, Германіі, Францыі, Польшчы, Літвы, Латвіі). Несумненна, вялікае значэнне мае падтрыманне асабістых кантактаў з вядучымі гісторыкамі пазначанай тэмы.**



*Інеса Двужыльная.*

— Праблемай, звязанай з адлюстраваннем тэмы Халакосту ў музычным мастацтве, я пачала сур'ёзна займацца пасля абароны ў снежні 2005 года ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай мастацкаму кірунку — амерыканскаму мінімалізму, — расказала Інеса Двужыльная. — Адзін з опусаў класікаў мінімалістаў — квартэт «Розныя цягнікі» Стыва Райха — раскрываў гэтую няпростую тэму. Затым была канферэнцыя ў Маскве, дзе я выступіла з дакладам на секцыі «Халакост», якую ўзначаліў сустаршыня навукова-асветніцкага цэнтра «Халакост» у Маскве, кандыдат гістарычных навук, чалавек глыбінных ведаў Ілья Аляксандравіч Альтман. Менавіта тады трагедыя Халакосту паўстала ў іншым бачанні. Асабліване месца ў маім успрыманні трагедыі беларускага яўрэйства адыграў і любімы горад Гродна, дзе нарадзілася і вырасла, працую цяпер. Зусім відавочныя рэчы — «на планеце Зямля не можа быць лішніх людзей» — убачыліся па-новаму.

Паводле слоў вучонага, яна ўсведамляе яшчэ і той факт, што ў кожнага чалавека ёсць свая місія. «Магчыма, мая заключаецца ў тым, каб завастрыць увагу сучаснікаў на тым, што самае дарагое у чалавека — гэта жыццё. Мовай музыкі таксама можна захаваць памяць аб тых, каго гвалтоўным шляхам пазбавілі жыцця», — лічыць Інеса Фёдараўна.

Па зразумелых прычынах яна абмежавала кола даследавання, узяла за аснову творчасць кампазітараў славянскіх краін — Беларусі, Украіны, Расіі. Атрымаўся надзвычай прадстаўнічы корпус музычных твораў розных жанраў: оперы, сімфоніі, вакальна-сімфанічныя паэмы, кантаты і араторыі, камерная вакальная і інструментальная музыка. Вынікам даследавання стала абарона доктарскай дысертацыі «Тэма Халакосту ў акадэмічнай музыцы Беларусі, Украіны, Расіі», матэрыялы якой увайшлі ў манаграфію 2022 года.

На гэтым доўгім шляху — з 2005 да 2023 года — Інеса Двужыльная сустрэла ўнікальных людзей, аўтараў музыкі і іх сваякоў, гісторыкаў, філосафаў, сацыёлагаў, у якіх вучылася, з прагнасцю набывала новыя веды. Цяжкасці ў рабоце з гэтай складанай тэмай датычылі толькі ўласнага фізічнага і псіхалагічнага стану. Кожны раз, калі выступала з чарговым дакладам на канферэнцыях, дзе збіраліся музыказнаўцы, якія ўсведамляюць складанасць псіхалагічнага ўспрымання музычнага матэрыялу, яны задавалі толькі адно пытанне: «Як вы ўсё гэта вытрымліваеце?!».



*Танга смерці.*

У сваіх публікацыях музыказнаўца не раз адзначала, што для вязняў гета «актам духоўнага супраціву было музычнае жыццё». Не існавала такога гета, вязні якога не спявалі б яўрэйскія песні. І хоць вучоны не з'яўляецца даследчыкам музыкі ў канцлагерах і гета, часткова ў сваіх артыкулах і манаграфіі 2016 года закранала гэтае пытанне. І вельмі займальна распавядала ў сваіх публікацыях пра Тэрэзін, пра тамтэйшыя яўрэйскія вакальныя калектывы, аркестры класічнай і папулярнай музыкі. У манаграфіі «Тэма Халакосту ў акадэмічнай музыцы» чытаем: «У перыяд Трэцяга рэйха Тэрэзін аказаўся тым месцам, дзе ствараліся сусветныя шэдэўры. У адным са сваіх апошніх эсэ Віктар Ульман пісаў: "Тут, у Тэрэзіне, дзе трэба штодня пераадольваць супраціў матэрыі, усё навакольнае варожае музам, — тут сапраўдная школа майстэрства…"»

— Гета Тэрэзін на тэрыторыі сучаснай Чэхіі было па-свойму ўнікальным, пра яго культурнае жыццё пісалі многія аўтары, — гаворыць Інеса Двужыльная. — Варта звярнуцца да выданняў Алены і Сяргея Макаравых «Крэпасць над безданню», пабудаваных на архіўным матэрыяле. Выдадзена чатыры кнігі, яны маюцца ў вольным інтэрнэт-доступе. Адзначу, што музыку кампазітараў Тэрэзіна добра выконваюць за мяжой. Існуюць цэлыя праекты, выдаюцца дыскі з творамі Віктара Ульмана (*Viktor Ullmann*), Гідэона Кляйна (*Gideon Klein*) і іншых кампазітараў Тэрэзіна, якія можна знайсці на пляцоўцы *YouTube*. Опера Ганса Краса «Брундыбар» існуе ў самых розных выканальніцкіх версіях. Менавіта творы, якія гучалі ў шматпакутным Тэрэзіне, і з'яўляюцца пацвярджэннем вялікай ролі музыкі для вязняў гета, якія жылі ў нечалавечых умовах.

***У сваіх публікацыях музыказнаўца не раз адзначала, што для вязняў гета «актам духоўнага супраціву было музычнае жыццё». Не існавала такога гета, вязні якога не спявалі б яўрэйскія песні. І хоць вучоны не з'яўляецца даследчыкам музыкі ў канцлагерах і гета, часткова ў сваіх артыкулах і манаграфіі 2016 года закранала гэтае пытанне. І вельмі займальна распавядала ў сваіх публікацыях пра Тэрэзін, пра тамтэйшыя яўрэйскія вакальныя калектывы, аркестры класічнай і папулярнай музыкі. У манаграфіі «Тэма Халакосту ў акадэмічнай музыцы» чытаем: «У перыяд Трэцяга рэйха Тэрэзін аказаўся тым месцам, дзе ствараліся сусветныя шэдэўры. У адным са сваіх апошніх эсэ Віктар Ульман пісаў: "Тут, у Тэрэзіне, дзе трэба штодня пераадольваць супраціў матэрыі, усё навакольнае варожае музам, — тут сапраўдная школа майстэрства…"»***

«Напрыклад, добра вядома, што ў Аўшвіцы існаваў жаночы аркестр, — чытаем у адной з работ Інесы Двужыльнай. — Безумоўна, увага нацыстаў да выдатнай асобы Альмы Розэ, кіраўніка аркестра, і ўменне жанчыны знайсці кампрамісныя рашэнні з начальствам лагера смерці, захоўваючы свае чалавечыя добрыя якасці, — гэта вялікае мастацтва. Сёння варта згадаць многія творы, прысвечаныя мемарыялізацыі трагедыі Халакосту. Яны належаць кампазітарам розных краін. Аднолькава магутна выглядаюць Трынаццатая сімфонія Д. Шастаковіча, опера "Пасажырка" М. Вайнберга, монаопера "Дзённік Ганны Франк" Г. Фрыда; *dramma per musica* "Бабін Яр" Д. Крывіцкага, рэквіем-кадыш "Бабін Яр" Я. Станковіч; рэквіемы Д. Лігеці, В. Кіслякова, *"Dies Irae"* Д. Пендэрэцкага; кантаты "Ацалелых з Варшавы" А. Шэнберга, "Галасы Тэрэзіна" Д. Крывіцкага; паэмы "Вечна жывыя" Г. Вагнера, "Боль зямлі" І. Левіна, "Януш Корчак" А. Галіча, "Яд ва-Шэм" З. Ткач".

Як вядома, музыка вечная. Яна выглядае адным з найлепшых помнікаў трагедыі ХХ стагоддзя — Халакосту, той трагедыі, што павінна служыць урокам нашчадкам.

**Міхаіл СТРАЛЕЦ**
**Фота з адкрытых крыніц**



*Канцэнтрацыйны лагер Маўтхаўзен (Аўстрыя).*



*Канцэнтрацыйны лагер Яноўскі (г. Львоў).*

# «А мой сакрэт — мой непаўторны свет...»

**У Доме літаратара два разы на месяц збіраецца таленавітая моладзь. Хлопцаў і дзяўчат, хоць і рознага ўзросту і літаратурнага майстэрства, аб'ядноўвае галоўнае: мы ствараем добразычлівае творчае асяроддзе, якое спрыяе пісьменніцкай вучобе, натхняе на сур'ёзную працу ў літаратуры. Любы пачынаючы паэт ці празаік можа прыйсці сюды, каб пазнаёміцца з калегамі-аднадумцамі, падзяліцца сваімі творамі, абмеркаваць навіны літаратурнага і калялітаратурнага жыцця. За пяць месяцаў наша суполка стала паўнавартаснай дыялогавай пляцоўкай для моладзі. Цяпер жа хочацца, каб старэйшыя масцітыя калегі-прафесіяналы звярнулі на нас увагу і наведвалі нашы пасяджэнні, каб перадаць часцінку свайго вопыту і майстэрства. Яшчэ моладзь прагне публікацый, і ўжо многія аўтары маюць персанальныя падборкі вершаў на старонках часопісаў «Бярозка», «Маладосць», «Полымя» і ў «ЛіМе». Спадзяюся, не за гарамі і выданне калектыўнага зборніка нашай «Майстэрні пісьменніка». А пакуль да ўвагі чытача новы паэтычны набытак.**

Рагнед МАЛАХОЎСКІ

## Андрэй ДАРОЖКІН

### Адзіны квіток

*За чорнай заслонай неба —*
*Падмосткі тэатра часу.*
*Білет набываць не трэба,*
*Даўно не працуе каса.*

*Бо кожнаму з нас адзіны*
*Даваўся квіток жыццёвы:*
*На век ці на паўгадзіны,*
*На песню ці на два словы.*

*Відовішч далі і хлеба —*
*Багата ўсяго прыхавалі:*
*І там — за заслонай неба,*
*І тут — у «глядзельнай зале».*

## Аляксандра ЖАЛЯЗНОВА

### Я выбіраю шчасце

*Меняю свой напрамак і сусвет.*
*Ёсць выбар, і я выбіраю шчасце.*
*Хай свет квітнее, што стварыў паэт, —*
*Жаданых слоў і палымянай жарсці.*

*Пяшчотных думак, легкакрылых мар,*
*Заўсёды неабходнай нам надзеі...*
*А неба адвыкае ўжо ад хмар,*
*Натхняючы на новыя падзеі,*

*Якія зменяць не адно жыццё,*
*Запаляць вочы, нібы ў небе зоркі.*
*Цябе шукае тое, што тваё,*
*І на душы не так, здаецца, горка.*

*Напэўна, кожны мае свой сакрэт,*
*Які за грошы не купіць, не скрасці.*
*А мой сакрэт — мой непаўторны свет.*
*У ім жыву, бо выбіраю шчасце.*

## Мацвей ЛІШЫН

* * *

*Рукі-вечнасці, рукі-галіны*
*Павуціннем да сонца імкнуць,*
*Дзе нячутны птушыныя кпіны,*
*Толькі зоркі пяшчотна пяюць.*

*Зледзянелая крохкая постаць*
*Бы імкнецца падоўжыць спакой,*
*Без якога вялікае мноства*
*Звар'яцела бясснежнай зімой.*

*Рукі-вечнасці, рукі-галіны...*
*А на вуснах — бясконцасці шлях.*
*Успаміны альбо напаміны,*
*Што вандруюць па нашых краях.*

* * *

*Барвовы ранак сустракае...*
*Няма прытулку ў гэтым дні.*
*То снег, то дождж перашкаджае...*
*Мільгаюць ліхтароў агні.*

*Квітнее роспач з кожным крокам,*
*Цвярозы, дзякуй Богу, стан.*
*Як да вясны яшчэ далёка!*
*І безліч слоў... І зноў падман.*

*Няма нічога, нават сонца*
*Не хоча радаваць сабой.*
*Так кожны з нас ідзе бясконца*
*За пуцяводнаю журбой.*

## Ірына РАДЗІХОЎСКАЯ

* * *

*Спіць зямля. Горад спіць. Спяць кватэры.*
*Сны сплятаюцца з зорным святлом.*
*Свечкі полымя ліжа паперу*
*Над старэнькім драўляным сталом.*

*Нішчыць словы агеньчык дрыготкі,*
*Нібы моц у ім ёсць для таго,*
*Каб сціраць нагаворы і плёткі,*
*І пачуцці, і веру ў багоў.*

*Што мацнейшае: свечка ці слова?*
*Што пакіне свой след у вяках?*
*Дзе ўсёй мудрасці свету аснова,*
*Дзе шаленства займела размах?*

*Горад спіць, зорным пылам пакрыты.*
*Попел шэры сабраны ў далонь —*
*Сцерлі словы. Агарак забыты*
*На стале. Бо задзьмулі агонь.*

* * *

*Калі адчуваеш патрэбу*
*Схапіць у далоні паветра,*
*Даверыцца яснаму небу,*
*Услухацца ў подыхі нетраў,*
*Тады разумееш больш поўна,*
*Што шчасце — яно ў простых рэчах,*
*У тым, як мільгае чароўна*
*Любоў да жыцця ў вачах нечых.*

*Рукой дакранешся да зорак,*
*Але не адзін — толькі разам.*
*І лёну блакітнага мора*
*Ў вачах адаб'ецца адразу.*
*Пад поглядам родных нябёсаў*
*Вы свой адшукаеце шлях.*
*А ты пакахаеш дзівосы,*
*Што свецяцца ў любых вачах.*

## Арсеній ГРОДА

* * *

*Зубы ЛЭП з брэкетамі правадоў*
*Чакаюць, калі сківіцы —*
*Зямля і неба —*
*Сціснуцца.*
*У металічнай пашчы —*
*Пакамечаныя сляды на снезе,*
*І вецер, які іх заносіць,*
*Дым з заводскай трубы*
*І аблокі,*
*Рака Бяссонне*
*І сон у чэрвеньскую ноч*
*Стануць адным.*

* * *

*Месяц прыліп да неба,*
*Сумны ашчэпак фіранкі*
*Са старога вагона.*
*Набрынялы цьмяным святлом*
*Бледных лямпаў,*
*Пахам мускусу і ацэтону.*
*Месяц — пляма на нёбе,*
*Неба астэроідам-языком,*
*Як жуйку з зубоў,*
*Дастае яго*
*І пакідае пад столікам.*

## Ангеліна БАЙКО

### Цяжкая дарога

*Цяжкая дарога,*
*Камяні, вятры...*
*Не відаць нічога,*
*Вочы хоць пратры.*
*Лёгка не ўдаецца*
*Мне яе прайсці.*
*Штосьці не ліецца*
*Шчасце па жыцці.*

*Хтосьці спатыкнуўся,*
*Ідучы па ёй,*
*Хтосьці дакрануўся*
*Да скалы нагой.*

*Мноства ёсць каменняў*
*На дарозе гэтай.*
*Рушыць без сумненняў —*
*Вось якая мэта.*

*А калі туманна —*
*Лепей прыглядзіся.*
*Сэрцу не заганна —*
*Ў цяжкі шлях імкніся.*

*Хтосьці крочыць доўга,*
*Хтосьці йдзе нямнога...*
*Розная для кожнага*
*Цяжкая дарога.*

## Вераніка ЛАЙКОВА

### Мастак

*Разлучаны ўнутры мяне навек*
*Дзве непадзельнасці — мастак і чалавек.*
*Нявольнікі бясконцай перапалкі,*
*Што рвуць душу на два кавалкі...*

*А хто таму віной аднойчы ўзнік:*
*Калега ды сябрук, і лёсам — бы двайнік.*
*Яму праменні славы раз зальснілі —*
*Я ценем за ім рушыў той жа хвіляй.*

*Як птушка рада крошкам ад абеду,*
*Я мог быць рады сваёй долі беднай —*
*Пакору меў як чалавек. А дух*
*Не даў у цені быць чужых заслуг.*

*Ўва мне разлад той толькі гнеў пасеяў*
*І ўраз зрабіў найгоршым са зладзеяў.*

## Паліна КОРНЕВА

### Богу

*Каб не бачна было плямаў слёз,*
*Я туманам закрыю шчокі.*
*Потым гляну на свет нябёс*
*«Ці ты тут, ўсёмагутны і строгі?»*

*Ці тваёй рукі справа спее*
*Перад гулкай маёй цішынёй?*
*Ці тваё цяпло ў сонцы грэе*
*Над чароўнай маёй вышынёй?*

*Ты з'яўляешся ценем мне ўночы*
*І гуляеш з каханнем маім.*
*Ты ў лісці пажоўклым, ты восень,*
*Белы ліст у блакноце старым.*

*Я не бачу цябе, толькі подых*
*Да маёй дакранецца шчакі.*
*Я прашу: дай мне веры і сілы*
*Каб нарэшце цябе знайсці...*

## Кацярына РОЎДА

### Пакуты творчасці

*(Дыптых)*

**1.**

*Я рыфмамі плакаць, кахаць і смяяцца*
*Прывыкла. Здаецца, інакш нерэальна.*
*Нібыта абцасамі ноччу па пляцы*
*Па клавіятуры гуляю кранальна.*

*Радок за радком... То узнёслась, то горыч,*
*То споведзі ціхай малітва жывая.*
*Я вершамі з кімсьці так блізенька... поруч.*
*Ды імі ж камусьці навекі чужая.*

*Дарую сама і прашу прабачэння*
*Праз часам наіўныя ямбы, харэі.*
*У водах рытмічных шукаю збаўлення,*
*А потым паэзіяй сэрца хварэю.*

*Шукаю адказы на сотні пытанняў.*
*Гартаю ўспаміны мінулага лета.*
*Пішу позна ноччу, дапісваю ўранні.*
*Не ў сілах звярнуць са сцяжыны паэта.*

**2.**

*Ці добра гэта, ці да спусташэння,*
*Але ў мяне за месяц — ні радка.*
*Пусты нататнік, быццам бы кішэня,*
*І піша, ды не рыфмамі, рука.*

*Мо ўсё прайшло? Або перазагрузка?*
*І вернуцца ізноўку па вясне*
*Натхнення птушкі, каб па-беларуску*
*Узнёсла-светла акрыляць мяне?*

*А, можа, не? І мне наканавана*
*Замкнуць паэта ў глыбіні душы*
*За тое, што працуе не старанна?*
*Ці ж я змагу? О, розум, не смяшы!*

*Хоць зрэдку ці то градам новых вершаў*
*Дзяліцца буду шчыра, не інакш,*
*І будзе кожны новы, быццам першы.*
*Спачатку — толькі мой, а потым — ваш!*

*Цяпло душы — паэзіі насенне.*
*Вы бачыце, з'явіліся радкі!*
*Нататнік не пусты ўжо, бы кішэня.*
*Квітнеюць вочы, быццам васількі!*

## Паліна ДВАРАНСКАЯ

* * *

*Яны сварацца, нішчаць усё хараство,*
*Што стварылі не за адзін вечар,*
*А потым разам запальваюць свечку*
*За святочным сталом на Раство.*

*Яны ўжо звыклі да ўсіх правілаў гульні:*
*Ім даспадобы трагіфарсы і пародыі!*
*«Сыходзь з майго жыцця! Назаўсёды!» —*
*Ніколі не прамовяць яны ўслых,*

*Хоць словы гэтыя і кожную хвіліну*
*Іх душы раз'ядаюць, ціха і павольна,*
*Пакуль не загарыцца там агеньчык кволы:*
*Яшчэ не позна выбраць іншую сцяжыну!*

*Але ўнутры яны даўно знявечаны*
*Ад роднай ды салодкай сваёй гнілі.*
*Пакуль іх хвалі цёплыя не змылі,*
*Яны плылі ўсё па цячэнні рэчыі,*

*Вада ў якой адвеку была чорнай:*
*Але калі так хочацца таніць сябе ў падмане,*
*Хіба чамусь навучаць свае шнары?*
*Усё забівае бляск вачэй няўмольных:*

*У іх шкло і жвір, але не чалавечнасць:*
*Не з'явіцца яна там ужо ніколі,*
*Нібыта рыбіну магчыма злавіць у полі!*
*Так застанецца, чуеце? Вы разам!*
*Вечна! Вечна!*

*Яны пасварыліся, знішчылі ўсё хараство*
*І разышліся, каб хаця б у апошні свой вечар*
*Кожны з іх запаліў адзінокую свечку*
*За святочным сталом на Раство.*

# Марозныя ўзоры дзіцячай творчасці

**Зноў паглядзець на зіму з дзіцячым захапленнем і атрымаць пазітыўныя эмоцыі можна на V штогадовай выстаўцы-конкурсе «Зімовыя ўражанні» ў галерэі «Універсітэт культуры». У экспазіцыі — работы вучняў дзіцячых школ мастацтваў Мінска, а таксама выхаванцаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.**

Выстаўка-конкурс ужо стала чароўнай зімовай традыцыяй. За ўвесь час правядзення былі прадстаўлены сотні юных талентаў. Гэта добрая магчымасць праявіць сябе, паказаць свае творчыя здольнасці шырокай аўдыторыі. Удзельнікі атрымліваюць ацэнку прафесійных членаў журы, знаёмяцца з творчасцю маладых калег, што садзейнічае пашырэнню мастацкага кругагляду.



*Уладзімір Фоміч, Дар’я Халецкая, Марыя Мініч, Сафія Суворава «На зімовых вакацыях у бабулі»*

Мэта праекта — удасканаленне маральнага выхавання і фарміраванне творчай індывідуальнасці вучняў, падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі ў сферы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У склад журы ўвайшлі прафесійныя мастакі, выкладчыкі выяўленчага мастацтва і мастацтвазнаўцы.

Галерэя «Універсітэт культуры» імкнецца падтрымаць творчую моладзь у адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці. Юныя творцы змаглі перадаць свае ўражанні пра зімовую пару ў жывапісе, графіцы, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Удзельнікі выстаўкі-конкурсу ацэньваюцца па трох узроставых катэгорыях: 6–10, 11–13, 14–17 гадоў. Пераможцы і прызёры ў кожнай катэгорыі атрымліваюць дыпломы.

У экспазіцыі пераважаюць жывапісныя работы, выкананыя ў розных жанрах, стылях і тэхніках. На выстаўцы можна ўбачыць вясковы і гарадскі пейзажы, бытавыя сцэнкі і анімалістычныя карціны. Творцы працуюць у традыцыйных тэхніках жывапісу, выкарыстоўваючы просты аловак, алей і акрыл, аднак трапляюцца і незвычайныя змешаныя мастацкія прыёмы. Сярод разнастайных твораў асабліва вылучаюцца работы вучняў ДУА «Дзіцячая мастацкая школа мастацтваў № 3 імя Л. Д. Шчамялёва г. Мінска» (педагог А. М. Палтаўчанка). Спалучэнне яркіх насычных фарбаў і тонкіх, «паветраных» тканін ствараe ўражанне, быццам глядзіш на свет праз прыгожыя вітражы.

Зіма для многіх асацыіруюецца з чараўніцтвам, феерверкамі, сусветным яднаннем перад вялікім цудам. Творы вучняў дзіцячай школы мастацтваў № 1 г. Мінска «Вуліца салютаў» Ксеніі Петрушэні, «У чаканні цуду» Аніссі Пігулеўскай, «Вечаровая завея» Софіі Корзун напаўняюць выставачную прастору адчуваннем затоенай радасці, верай у лепшае і дзіцячым захапленнем. Мастакі выкарыстоўваюць розныя вобразы, аднак іх аб’ядноўвае яркі святочны горад і ўпрыгожаныя вулачкі. Можна адчуць сябе героем гэтых карцін, на хвіліначку стаць Кевінам з класічнага каляднага фільма «Адзін дома» і адправіцца ў падарожжа па заснежаных прасторах.

У экспазіцыі можна ўбачыць вядомыя казачныя сюжэты, сцэны з мультфільмаў і інш. Работа Кацярыны Карымавай «Зімовая казка» адсылае гледача да казкі «Дванаццаць месяцаў», а назва твора «Зіма ў Прастаквашына» кажа сама за сябе. У творчасці юных мастакоў адлюстраваны святочныя традыцыі, сярод якіх можна знайсці і калядныя звычаі нашых продкаў (Кацярына Антончык «Святочны вечар», Іван Колій «Марозны дзень на Каляды»).



*Ульяна Софіна «Лісічка».*



*Аляксандра Гараніна «Навагодняе ззянне».*

Творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва прадстаўлены ў аўтарскім і калектыўным выкананні. Прыцягвае ўвагу адмысловая ялінка з натуральных матэрыялаў вучняў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі народнай студыі «Славянскі вянок». На яе галінках размясціліся жыхары лесу, героі калядных сюжэтаў і народных казак. Калектыўная работа «Калядоўшчыкі» (Мінскі гарадскі каледж мастацтваў) таксама дэманструе наведвальнікам багатую на гісторыі і традыцыі культуру нашых продкаў. Кожная фігурка калядоўшыка выраблена з гліны, распісана аўтарскім малюнкам ці беларускім арнаментам. Некаторыя статуэткі можна выкарыстоўваць як падсвечнікі.

Не ўвесь посуд створаны для ежы, і работа Паліны Андрэевай «Студзеньскі іней» гэта пацвярджае. Юная творца паспрабавала адлюстраваць непаўторнае ззянне і чараўніцтва першага снегу, яго халодную, але прывабную прыгажосць.

На выстаўцы можна ўбачыць аўтарскія пано з саломы, на якіх таксама размясціліся калядныя сюжэты, вырабы з дрэва і шкла.

Праект працуе да 18 лютага.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА,**
**фота аўтара**

## зваротная сувязь

# На любы ўзрост і густ

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У праграме «Нам засталася спадчына» (сумесна з Інстытутам літаратуразнаўства НАН Беларусі) — працяг гаворкі пра твор Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра», а таксама пра мысліцеля, пісьменніка, перакладчыка і палеміста, тэолага і выдаўца, аднаго з самых адукаваных людзей свайго часу Сымона Буднага. Навум Гальпяровіч гутарыць з прафесарам Іванам Саверчанкам.

Праграма «Прачулым радком» у суботу і нядзелю прапануе вершы Анатоля Зэкава ў выкананні артыста Алега Вінярскага.

У перадачы «Літаратурная анталогія» па буднях — раман Маргарэт Мітчэл «Знесеныя ветрам». У «Радыёбібліятэцы» — твор Івана Шамякіна «Шлюбная ноч». Выканаўца — артыстка Маргарыта Захарыя.

«Радыёсерыял» пазнаёміць з раманам Луізы Мэй Олкат «Маленькія жанчыны», чытае артыстка Ліка Пташук.

У «Літаратурных гісторыях» гучаць апавяданні айчынных і замежных аўтараў.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — чытанне кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Вухуцік і дзіва». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У праграме магчымы змены.

## Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

**31 студзеня** — у бібліятэку № 13 (вул. Народная, 10) на Свята дзіцячай кнігі. Пачатак у 14.30.

**3 лютага** — у дзіцячую бібліятэку № 12 (вул. Прытыцкага 18, к. 3) на творчую сустрэчу са Святланай Бахновай. Пачатак у 11.30.

**4 лютага** — на творчую сустрэчу Міхася Пазнякова са старшакласнікамі гімназіі № 39 (вул. Кунцаўшчына, 10). Пачатак у 13.00.

**4 лютага** — у бібліятэку № 7 (Плеханава, 97, к. 4) на творчую сустрэчу з Вольгай Сакаловай і Таісіяй Трафімавай. Пачатак у 16.00.

**5 лютага** — у Палац ветэранаў на творчую сустрэчу з Анатолем Аўруціным. Пачатак у 16.00.

**6 лютага** — на творчую сустрэчу Міхася Пазнякова з юнымі чытачамі СШ № 1 (вул. Чкалава, 3а). Пачатак у 11.00.

**6 лютага** — у дзіцячую бібліятэку № 14 (вул. Варвашэні, 11) на творчую сустрэчу з Інай Фралова й. Пачатак у 12.30.

**7 лютага** — у Чысцінскую сярэднюю школу Маладзечанскага раёна на творчую сустрэчу з Тамарай Бунта. Пачатак у 10.30.

**7 лютага** — у дзіцячую бібліятэку № 16 (вул. Якубоўскага, 32) на творчую сустрэчу з Уладзімірам Мазго. Пачатак у 15.00.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Віктара (Вікенція) Канстанцінавіча ГАРДЗЕЯ і выказваюць спачуванні яго родным і блізкім.


**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:** Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Вольга Аляксандраўна АНУФРЫЕВА

Нумар падпісаны ў друк
30.01.2025 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 818

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 195

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686